16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 36 (5245) 8 верасня 2023 г. ISSN 0024-4686

Жыццё — пытанні без адказаў стар. 7

На добры ўспамін пра класіка стар. 13

Сонца Чынгіза Айтматава стар. 14

У гонар магутнага слова

Фота Віктара Іванчыкава.

Падчас уручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі.

Гарадок прыняў XXX юбілейны Дзень беларускага пісьменства. У першыя выхадныя верасня райцэнтр на самай поўначы Беларусі пераўтварыўся ў маштабную фестывальную пляцоўку са шматлікімі інтэрактыўнымі падворкамі і тэматычнымі павільёнамі. Мы завіталі на свята і занатавалі самыя яркія моманты юбілейнага фестывалю.

На цырымоніі ўрачыстага адкрыцця юбілейнага Дня пісьменства раскрылася адна з галоўных інтрыг года ў літаратурным асяроддзі краіны — абвясцілі імёны лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Імі сёлета сталі шэсць аўтараў. Найлепшым празаічным творам прызнана кніга «Па веры вашай…» Уладзіміра Гаўрыловіча. «Несучы па жыцці свой духоўны крыж, усе героі майго твора праходзяць цяжкі шлях да ачышчэння. Яны абараняюць сваю веру, род і сям'ю, гістарычную памяць сваёй шматпакутнай зямлі, прызываюць усіх нас, беларусаў, не захлынуцца ў дыме матэрыяльных выгод, уяўнага дабрабыту, хцівага "клопату" чужынцаў пра нас. Падзеі ў рамане адбываюцца ў нашы дні, у 2020 і 2021 гадах, а таксама дзесяць стагоддзяў таму ў старажытных Тураве, Кіеве і Кракаве. Кніга заклікае чытачоў шанаваць мінулае, каб зразумець сапраўднае, каб клапаціцца пра сваю будучыню і будучыню свайго народа, Айчыны, Беларусі», — адзначыў Уладзімір Мікалаевіч.

Працяг тэмы на стар. 4 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў навучэнцаў, студэнтаў, аспірантаў, настаўнікаў, навукова-педагагічных работнікаў з Днём ведаў і пачаткам новага навучальнага года. «Першага верасня — наша агульнае свята: усіх, хто пачынае вучобу, хто вучыць і хто ўсё жыццё захоўвае самыя добрыя ўспаміны аб сваіх настаўніках, — падкрэслена ў віншаванні. — Няхай кожны новы дзень будзе напоўнены руплівай стваральнай працай і радасцю дзівосных адкрыццяў. Асаблівыя віншаванні адрасую нашым першакласнікам і іх бацькам. Вы, самыя юныя школьнікі, цяпер пачынаеце свой шлях у краіну ведаў. Верце ў сябе, і ў вас усё атрымаецца».

• Прэзідэнт Беларусі павіншаваў народнага артыста Беларусі Уладзіміра Правалінскага з 75-годдзем. «Вашы індывідуальнасць, выканальніцкае майстэрства і высокі прафесіяналізм выклікаюць шчырую павагу і любоў шматлікіх паклоннікаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Упэўнены, што і ў далейшым вы будзеце ўносіць значны ўклад ва ўзбагачэнне і росквіт беларускай культуры, дарыць радасныя хвіліны аматарам музычнага мастацтва». Аляксандр Лукашэнка пажадаў Уладзіміру Правалінскаму моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, шчасця і дабрабыту.

• Кіраўнік дзяржавы накіраваў віншаванне жыхарам Ліды і Лідскага раёна з 700-гадовым юбілеем горада. «Гісторыя горада сваімі каранямі ідзе ўглыб стагоддзяў. Вы атрымалі ў спадчыну багатыя традыцыі, духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, сярод якіх — знакаміты Лідскі замак, што даўно стаў візітнай карткай рэгіёна і штогод прыцягвае тысячы турыстаў», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння Ліда — гэта горад, накіраваны ў будучыню: будуецца жыллё, развіваецца сацыяльная сфера, абнаўляецца інфраструктура. «Самых добрых слоў заслугоўваюць вашы любоў да сваёй малой радзімы, павага да памяці продкаў, клопат пра захаванне непарыўнай сувязі часоў і пакаленняў. Упэўнены, так будзе і ў далейшым», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Актуальна. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 275 «Аб падтрымцы асобных дзяржаўных арганізацый культуры». У адпаведнасці з дакументам з 1 студзеня 2024 года змяняюцца падыходы да фінансавання дзейнасці дзяржаўных тэатраў. Фінансаванне расходаў са сродкаў бюджэту і ўласных сродкаў тэатраў будзе ажыццяўляцца ў прапорцыях 60/40 адпаведна пры стварэнні новых пастановак і правядзенні гастролей, а таксама аплаце камунальных паслуг і эксплуатацыйных расходаў, выплаце заработнай платы. Напрыклад, рамонт і набыццё абсталявання будуць ажыццяўляцца ў поўным аб'ёме за кошт бюджэтных сродкаў. Накіраванне сродкаў бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі на выплату ўзнагароджанняў работнікам дзяржаўных арганізацый культуры арыентавана на пашырэнне механізму сацыяльнай падтрымкі штатных супрацоўнікаў і павелічэнне іх матывацыі. Пералічаныя падыходы будуць дзейнічаць да канца 2024 года.

Афіцыйна. Галоўным мастаком Вялікага тэатра Беларусі стала Любоў Сідзельнікава. У 1987 годзе яна скончыла Мінскае дзяржаўнае мастацкае вучылішча імя А. Глебава, у 1994-м — Беларускую акадэмію мастацтваў. З 2007 да 2010 года займала пасаду галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. У Вялікім тэатры працуе з 2019-га. За гэты час Любоў Акцябрынаўна выступіла мастаком-пастаноўшчыкам многіх спектакляў. Любоў Сідзельнікава — член Беларускага саюза мастакоў, пастаянны ўдзельнік рэспубліканскіх выставак, лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў.

Рэгіён. Выстаўка, прысвечаная 110-годдзю зборніка «Вянок» Максіма Багдановіча, працуе ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі. Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Вольга Шылько расказала: «Выстаўка да 110-годдзя зборніка паэта — сумесны праект нашага музея і музея Максіма Багдановіча. Галоўная яе экспазіцыя складаецца з дзесяці планшэтаў з інфармацыяй аб жыццёвым шляху і творчасці лірыка, падмацаванай фотаматэрыяламі». Частка з іх прысвечана знаходжанню Максіма Багдановіча ў мястэчку Ракуцёўшчына. «У нашым музеі захоўваюцца рэліквіі — творы ў самім зборніку "Вянок". Як і арыгінальны зборнік, датаваны 1913 годам, што вялікая рэдкасць для Беларусі. Гэта менавіта той зборнік, што быў выдадзены ў друкарні Марціна Кухты. Таксама на выстаўцы прадстаўлены перавыдадзены ў 1927 годзе зборнік і факсімільная копія "Вянка" 2003 года, надрукаваная якраз да юбілею паэта», — адзначыла спецыяліст. Працаваць праект будзе да 16 кастрычніка.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Зрабіць лёс мастацтва шчаслівым

У літаратурнай Гродзеншчыны вялікая радасць. Літаратуразнаўца Аліна Сабуць стала лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства».

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, педагог, навуковец уганаравана за кнігу «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX—XXI стагоддзяў».

Крытыка — вельмі важны, адказны і працаёмкі від дзейнасці. Тут патрэбна шырыня кампетэнцый, глыбіня пазнанняў, а яшчэ — максімум такту, карэктнасці, далікатнасці. Дзейнасць нашай калегі і атрыманая высокая ўзнагарода даказваюць, што крытычнаму мысленню чалавека, накіраванаму ў канструктыўнае, стваральнае рэчышча, па сілах вобразна пераасэнсаваць творчы працэс, аптымізаваць яго вынікі і абудзіць цікавасць чытацкай аўдыторыі. Гэта значыць — зрабіць лёс мастацтва шчаслівым. Ад крытычнай літаратуры шмат у чым залежаць далейшыя шляхі айчыннага мастацтва слова. Самае галоўнае — кніга Аліны Сабуць падкрэслівае сацыяльную значнасць айчыннай літаратуры, разглядае яе багатыя традыцыі і сучаснасць як надзвычай актуальны сёння дыялог светапоглядаў.

Ад імя нашага творчага калектыву сардэчна віншуем калегу з атрыманнем высокай узнагароды — Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь! Шчыра жадаем моцнага здароўя, новых поспехаў і дасягненняў, невычарпальнай энергіі творцы, асветніка, вучонага, педагога, тым больш што гарманічнае адзінства менавіта гэтых амплуа ў вашай асобе, памножанае на бясцэнныя чалавечыя якасці — інтэлігентнасць, прыстойнасць і прыязнасць, дазволілі дасягнуць такога высокага выніку і разам з тым падняць на новы ўзровень развіцця літаратурны свет нашай Айчыны. Вы — наш гонар!

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ

з нагоды

У вянок Грачанікаву

На Гомельшчыне шырока адзначаюць 85-годдзе з дня нараджэння паэта, перакладчыка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Анатоля Грачанікава.

Землякі памятаюць свайго найлепшага сына, сапраўднага палешука. Іначай бы не сабраў Анатоль Грачанікаў столькі людзей напярэдадні свайго 80-годдзя там, дзе хадзіў маладым, задумваў новыя творы. Так, пяць гадоў назад у ціхім і прыгожым куточку горада над Сожам адбылося тое, пра што марылі ўжо не адно дзесяцігоддзе літаратары Гомельшчыны і прыхільнікі творчасці Анатоля Грачанікава — увекавечыць імя сапраўднага мастака слова менавіта ў нашым прыгожым абласным цэнтры, бо адсюль пачынаўся паэт.

Па ініцыятыве Савета абласной пісьменніцкай арганізацыі літаратары рэгіёну ахвяравалі ўласныя сродкі, і на доме, дзе жыў творца, у дзень яго нараджэння ў прысутнасці сям'і і шырокай грамадскасці, пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Украіны на XIII Міжнародным фестывалі-свяце «Славянскія літаратурныя Дажынкі» была адкрыта мемарыяльная дошка.

Каб ушанаваць памяць аб выдатным творцы-земляку, пісьменніцкім актывам вобласці практычна штогод праводзяцца паэтычныя конкурсы ў гонар выдатнага літаратара. Для фіналістаў і лаўрэатаў праводзяцца майстар-класы, найлепшыя з твораў друкуюцца ў альманаху «Літаратурная Гомельшчына». Так рыхтуецца новае пакаленне будучых паэтаў і празаікаў…

Не стаў выключэннем, дарэчы, і 2023 год. З нагоды 85-годдзя з дня нараджэння Анатоля Грачанікава ў фармаце міжнароднага конкурсу «Беларусь — Расія. Сожскія берагі дружбы» Гомельскім абласным аддзяленнем былі заснаваны дзве намінацыі на найлепшы пераклад твораў паэта з беларускай на рускую мову. У першай удзельнічалі маладыя аўтары-перакладчыкі з усёй Расіі, а ў другой — толькі суседзі гамяльчан, прадстаўнікі Браншчыны. Звыш 90 спроб пераўтварэння «Крывавай балады» ды некалькіх іншых мастацкіх твораў было даслана маладымі расіянамі. Уладальнікі другіх і трэціх месцаў былі ўзнагароджаны ў канцы ліпеня ў Таганрогу, дзе праводзіўся беларуска-расійскі форум паэзіі і паэтычных перакладаў «Берагі дружбы». А паэты, перакладчыкі Дзмітрый Несцярэнка з Тульскай вобласці, Наталля Мішына з Бранска запомняць дату нараджэння Анатоля Сямёнавіча на ўсё жыццё: атрымаюць ганаровы дыплом лаўрэатаў — сёння на ўрачыстым адкрыцці XVIII Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя Дажынкі». Разам з маладымі лаўрэатамі намінацый гэтага конкурсу (дарэчы, беларусы сёлета перакладалі творы Расула Гамзатава і кабардзіна-балкарскага класіка Алі Шагенцукава), а таксама з пераможцамі шэрагу літаратурных абласных конкурсаў яны ўскладуць кветкі да мемарыяльнай дошкі пісьменніка-земляка.

На творчых сустрэчах ва ўстановах культуры рэгіёна, а таксама і на малой радзіме паэта будуць гучаць творы Анатоля Сямёнавіча на беларускай і рускай мовах, пройдуць урачыстасці, арганізаваныя ў межах міжнароднага літаратурнага фестывалю, дзе літаратары Беларусі і Расіі будуць згадваць асобу і творчасць Анатоля Грачанікава.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ,
старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СПБ

імпрэзы

Там, у светлых барах

Другі раз напрыканцы жніўня вёсачка Шыпкі, што на Вілейшчыне, збірала жыхароў і гасцей на свята «Шыпкоўскія плёсы». Пад святочную пляцоўку была выбрана сядзіба ў жывапісным месцы: на беразе ціхаплыннай ракі Ілья.

Далёка несла рачная плынь узнёслыя паэтычныя радкі Віктара Шніпа, Іны Фраловай, Віктара Кажуры, Кацярыны Роўда. Адгукаўся спагадным пошумам векавы бор на душэўную песню ў выкананні Кастуся Цыбульскага. Сугучна прыроднай прыгажосці ляцелі песні народнага калектыву «Белы Птах».

Жаданым госцем была рэдакцыя газеты «Друг пенсіянера». Жыхары і ўдзельнікі свята атрымалі падарункі ад Генеральнага дырэктара Анатоля Гармазы — нумары свежых часопісаў і газет. Яркім выступленнем падтрымаў рэдакцыю паэт-песеннік Алег Жукаў.

Добра прымалі слухачы пісьменніка Сяргея Трахімёнка, музыканта Яўгена Хаменку, краязнаўцаў Аляксандра Плавінскага і Аляксандра Ратквеліча. Таксама падтрымалі і свайго маленькага земляка — Елісея Удавічэнку, які выканаў урывак з апавядання Антона Чэхава «Радасць».

Старшыня сельскага савета Дзіяна Грабянёк адзначыла граматамі пераможцаў конкурсу на найлепшы падворак.

Было чаканым выступленнем благачыннага Ільянскай царквы іерэя айца Андрэя Громава.

Ганна СТАРАДУБ
Фота дасланa аўтарам

пасляслоўе

Святочная «Дзвіна»

На Дзень беларускага пісьменства ў Гарадок прыехалі тысячы гасцей, каб адчуць адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай народа. Так, у пісьменнікаў была магчымасць сустрэцца з калегамі з розных рэгіёнаў краіны, абмяняцца кнігамі, падзяліцца літаратурнымі навінамі і, самае важнае, паразмаўляць з чытачамі. Тыя на літаратурных пляцоўках маглі пазнаёміцца з творчасцю аўтараў, пачуць новыя творы.

Тамара Краснова-Гусачэнка падчас святкавання Дня беларускага пісьменства.

Віцебшчыну на нацыянальным свяце прадстаўляла дэлегацыя на чале са старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамарай Красновай-Гусачэнкай. Перад гледачамі выступілі Мікалай Намеснікаў, Сяргей Трафімаў, Андрэй Герашчанка, Ірына Радзіхоўская, Сяргей Красаў, Мікалай Гарбачоў, Тамара Кавалёва, Іна Мароз, Андрэй Шуханкоў, Валерый Касаткін, Аляксандр Раткевіч, Мікалай Хахлоў і іншыя аўтары. Яны, між іншым, падзяліліся важкімі дасягненнямі за мінулы год. Літаратары Прыдзвіння прынялі актыўны ўдзел у стварэнні зборніка твораў, прысвечанага роднаму краю, — абласнога літаратурнага альманаха «Дзвіна. Віцебшчына літаратурная» (№ 7). Выданне з 350 старонак уключыла ў сябе творы 33 аўтараў.

Да свята роднага слова творцы падрыхтавалі чарговы выпуск альманаха «Дзвіна», які ўбачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі арганізавала святочную прэзентацыю альманаха з аўтографсесіяй на літаратурнай пляцоўцы «Слова пісьменніка». Дарэчы, у выданні прадстаўлены не толькі творы паэтаў і празаікаў, але і падрабязныя біябібліяграфіі кожнага члена пісьменніцкай арганізацыі. Кожны аўтар прадстаўлены на той мове, на якой піша, і ў жанры, найбольш характэрным для яго творчасці. Адзін з раздзелаў пад назвай «Мы памятаем» прысвечаны членам суполкі, якія пакінулі жыццё за апошнія гады.

За перыяд, які прайшоў са святкавання папярэдняга Дня беларускага пісьменства, аўтарамі Віцебскага абласнога аддзялення СПБ выдадзена больш за 50 кніг. Сёння пісьменнікі рэгіёна прымнажаюць літаратурныя традыцыі нашай зямлі, багатай на таленты. Менавіта яна дала свету імёны Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага, Васіля Цяпінскага, узрасціла Петруся Броўку, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Міхася Лынькова, Еўдакію Лось і многіх іншых майстроў слова.

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ

рэха падзеі

Подых лета ў мастацкім слове

19 жніўня ў гістарычным цэнтры Гродна, на пляцоўцы маладзёжнага цэнтра па вуліцы Савецкай, адбыўся музычна-паэтычны вечар «Подых лета» з удзелам маладых паэтаў Прынёмання. А дакладней — паэтэс.

Мерапрыемства арганізавана аддзелам культуры Гродзенскага гарвыканкама, дзяржаўнай установай «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры», дзяржаўнай установай культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» і прайшло ў рамках доўгатэрміновага праекта «Мерапрыемства выхаднога дня». Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі атрымала ад арганізатараў запрашэнне далучыцца да імпрэзы, якое ў небагаты на публічныя мерапрыемствы сезон летніх адпачынкаў з радасцю было прынята.

…Калі восенню чалавечага жыцця вобразна называюць пару сталасці і мудрасці, то асацыяцыі з летам — гэта бесклапотнасць юнацтва, цеплыня, пік росквіту прыроды, афарбаваныя ў адпаведныя светлыя эмоцыі. Мабыць, таму па задумцы арганізатараў да ўдзелу ў музычна-паэтычным вечары пад назвай «Подых лета» былі запрошаны аўтары-пачаткоўцы, якія, тым не менш, знаходзяцца ў сферы пільнай увагі абласной пісьменніцкай арганізацыі. На імправізаванай сцэне музычна-літаратурнага свята выступілі гродзенскія паэтэсы Кацярына Каламійцава, Алена Марынец, Антаніна Нурэтдзінава і госця з Ваўкавыска Караліна Макавецкая.

Караліна Макавецкая — новае імя ў літаратуры Прынёмання. Дзяўчына вучыцца ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, уваходзіць у літаратурны клуб «Катарсіс» (кіраўнік Віктар Варанец) і нават з'яўляецца сакратаром студэнцкага літклуба. У праграме суботняй імпрэзы паэтэса даволі артыстычна прачытала свае творы. Сёлета дзяўчына будзе прадстаўляць Гродзенскую вобласць на конкурсе маладых паэтаў «Мы рождены для вдохновенья» ў рамках Фестывалю рускамоўнай паэзіі Беларусі «Созвучье слов живых» (г. Брэст). Выступленне на свяце творчасці ў абласным цэнтры стала для Караліны добрай рэпетыцыяй.

Антаніна Нурэтдзінава ўжо можа пахваліцца перамогай у названым вышэй Брэсцкім паэтычным форуме, які адбыўся два гады таму. Аўтарская мастацкая мова мае шмат вынайдзеных слоў — аказіяналізмаў. Тое ж можна сказаць і пра творчы стыль Кацярыны Каламійцавай, пераможцы IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года», аўтара двух зборнікаў лірыкі «Нет Никого, Кроме Него» і «Женщина в красном». Кацярына ўключыла ў сваё выступленне творы з абедзвюх кніг. …Алена Марынец піша на беларускай мове. У актыве паэтэсы —пераклады паэзіі, яна фіналіст III Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу «Берега дружбы» (Расія). Асноўныя матывы паэзіі, прадстаўленай удзельнікамі суботняй імпрэзы, — рамантычны настрой лета, імкненне да шчасця і дабрыні, вера ў лепшае. Аўтары-пачаткоўцы пачулі заўвагі і каштоўныя парады ад абласной пісьменніцкай арганізацыі.

Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК, фота аўтара

да ведама

Выданням для дзяцей — асаблівая ўвага

Гомельскае выдавецтва «Барк» актыўна выпускае кнігі пісьменнікаў — членаў абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Тут рэгулярна выходзяць празаічныя і паэтычныя творы землякоў.

Разам з тым выдавецтва па магчымасці выдае беларускамоўныя кнігі не толькі землякоў, але і аўтараў, якія жывуць у іншых рэгіёнах нашай краіны. Асаблівай пахвалы заслугоўвае ўвага супрацоўнікаў «Барка» да кніжак, адрасаваных дзецям. Толькі ў апошнія тры-чатыры гады яны выдалі дзіцячыя кнігі Васіля Ткачова («Як сон знайшоўся»), Уладзіміра Бабкова («Хто прыручыць Чупакабру» і «Засталася толькі памяць»). У планах — выпуск зборнікаў твораў іншых аўтараў.

А нядаўна ў таварыстве з дадатковай адказнасцю «Барк» пабачыла свет новая кніга славутага беларускага дзіцячага пісьменніка Міколы Чарняўскага «Куды вядуць Куты». Яе склалі вершы, казкі, прымаўлянкі-забаўлянкі, легенды, загадкі. Кніга атрымалася вельмі змястоўнай і прывабнай, творы не сумныя, а ўсмешлівыя і вясёлыя, займальныя, з тонкім гумарам, дасціпныя, павучальныя. Да таго ж кніга выдатна, з густам афармлена.

Міхась СЛІВА

«ЛіМ»-люстэрка

Прыём заявак на ўдзел у VI Міжнародным фестывалі тэатральнага мастацтва «Тэрыторыя жэста» скончаны ў Маскве. На агляд прыедуць калектывы з Расіі, Арменіі і Беларусі, інфармуе «ИТАР-ТАСС». «Галоўная ўмова ўдзелу ў фестывалі — даступнасць спектакляў для людзей з абмежаваннем здароўя па слыху: спектаклі на рускай мове жэстаў, пластычныя спектаклі, спектаклі з перакладам», — адзначылі арганізатары. Агляд пройдзе ў Маскве з 30 кастрычніка да 4 лістапада. Так, на фестываль прыедзе гурт NRAV творчага калектыву артыстаў, якія не могуць чуць, «Запальвай» з Мінска, артысты з Народнага тэатра «Інклюзіён» Гомельскага гарадскога цэнтра інклюзіўнай культуры. Сёлета ў конкурснай праграме будуць прадстаўлены як міні-спектаклі, так і поўнафарматныя драматычныя, музычныя, пластычныя пастаноўкі, у якіх задзейнічаны больш за пяць артыстаў.

Конкурсная камісія XXIV расійскай Агульнанацыянальнай літаратурнай прэміі імя П. П. Бажова вызначыла шорт-ліст. Як паведамляе «ИТАР-ТАСС», у яго ўвайшлі работы аўтараў з Расіі, Ізраіля, Балгарыі, Беларусі, Узбекістана і Казахстана. Усяго на конкурс было заяўлена 556 твораў. Намінацыі — «Майстар. Проза», «Майстар. Паэзія», «Майстар. Публіцыстыка», «Карысць справы». Пераможцаў абвесцяць на фестывалі Бажова ў кастрычніку. Прэмія імя П. П. Бажова ўручаецца з 1999 года. У розныя гады лаўрэатамі станавіліся літаратурны крытык Валянцін Курбатаў, дзіцячы пісьменнік Уладзіслаў Крапівін, драматург Мікалай Каляда, празаік Вольга Слаўнікава.

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі правяла Міжнародны форум прадстаўнікоў прафесійнай музычнай адукацыі краін Еўразіі, аб чым інфармуе тэлеграм-канал Міністэрства культуры Беларусі. Як паведамляе міністэрства, у рамках маштабнага форуму адбылося сумеснае пасяджэнне Савета па пытаннях прафесійнай музычнай адукацыі (Беларусь), Федэральнага вучэбна-метадычнага аб'яднання ў сістэме вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі і Асацыяцыі музычных адукацыйных устаноў РФ. У праграме міжнароднай сустрэчы значылася дыскусійная пляцоўка «Сістэма бесперапыннай музычнай адукацыі ў нацыянальным кантэксце: вопыт краін Еўразіі», а таксама лекцыі, экскурсіі па гістарычным будынку Акадэміі музыкі і канцэрты. Удзельнікамі форуму сталі прадстаўнікі Расіі, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана, Манголіі і інш.

Дні культуры Растоўскай вобласці ў Беларусі пройдуць з 21 да 24 верасня, перадае БелТА. У краіну прыедзе больш за 600 дзеячаў культуры і мастацтва. Падчас Дзён культуры Растоўскай вобласці Данскі рэгіён прадставіць у Беларусі найлепшыя тэатральныя пастаноўкі, канцэртныя праграмы сімфанічнага аркестра і прафесійных калектываў. Музеі і бібліятэкі падрабязна раскажуць аб культурнай спадчыне Дона. Галоўная мэта Дзён культуры — умацаванне адносін у культурнай сферы, абмен перадавым вопытам. Мерапрыемствы пройдуць на шасці культурных пляцоўках — у Мінску, Віцебску і Слуцку. Асноўнай стане Палац Рэспублікі ў Мінску. Менавіта тут адбудзецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця Дзён культуры і канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля песні і танца Данскіх казакоў імя А. Квасава.

Дачу пісьменніка Валянціна Распуціна, размешчаную на беразе возера Байкал, адкрылі для наведвання пасля аднаўлення. Там будуць праводзіць экскурсіі, паведамляе «ИТАР-ТАСС». У пасёлку Байкал Слюдзянскага раёна адбылося ўрачыстае адкрыццё, а таксама абрад асвячэння будынка. У ім Валянцін Распуцін скончыў аповесць «Жыві і памятай», напісаў «Развітанне з Мацёрай», гэтым мясцінам прысвяціў апавяданні «Наташа», «Не магу!», «Век жыві — век любі», «Што перадаць вароне?». Дачу на беразе Байкала сям'я Распуціных набыла ў 1974 годзе. Сёння дому спатрэбілася поўная рэстаўрацыя. Інтэр'ер аднаўлены па ўспамінах сваякоў пісьменніка, захаваны і занялі сваё месца прадметы, якімі карыстаўся Валянцін Распуцін. Гэта стол, ложак-тапчан, дыванок з кавалка лінолеума, сваёльня. Аднаўленне дачы арганізавалі Іркуцкі абласны краязнаўчы музей імя М. М. Мураўёва-Амурскага і структура кампаніі «Газпром».

Арыгінальны эскіз англійскага кніжнага ілюстратара Эрнэста Шэпарда да дзіцячай аповесці Алана Мілна «Віні-Пух» быў знойдзены ў падвале букініста ў Вялікабрытаніі, паведамляе РІА «Новости». Адзначаецца, што гэта не першапачатковы эскіз, намаляваны для кніжнага выдання 1920-х, а аднаўленая рукой Эрнэста Шэпарда ілюстрацыя. Дагэтуль быў прададзены толькі адзін яго малюнак з гэтай сцэнай. Арыгінал прададзены летась за 220 тысяч долараў. Выяўлены малюнак будзе выстаўлены на аўкцыёне.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

У гонар магутнага слова

Узнагарода за творчасць

Найлепшым публіцыстычным творам прызнана кніга Уладзіміра Макарава «Во имя будущего страны. О приоритетах национальной безопасности в новом веке». «Гадоў пятнаццаць таму мне давялося даваць адказ у тым ліку тым, хто сёння збег. Хто ўнёс лепту ў тое, каб увесь Савецкі Саюз спяваў на беларускай мове? Уладзімір Мулявін, мой зямляк са Свярдлоўска. Упэўнены, беларуская мова па-ранейшаму будзе гучаць — і не толькі на постсавецкай прасторы, але і ва ўсім свеце. Сімвалічна, што Дзень беларускага пісьменства адзначаецца незадоўга да яшчэ аднаго сакральнага, свяшчэннага для ўсіх беларусаў свята, якое стала афіцыйным зусім нядаўна — Дня народнага адзінства. У 1939 годзе беларускі народ уз'яднаўся ў адзінай беларускай дзяржаве, і сёння мы ўпэўнены ў нашай будучыні. Бо па-ранейшаму запатрабаваныя словы нашага вялікага паэта Янкі Купалы: "Партызаны, партызаны, беларускія сыны! За няволю, за кайданы, каб не ўскрэслі век яны". Упэўнены, мы захаваем мір, незалежнасць і стабільнасць, таму што з намі наша тысячагадовая культура і мова Янкі Купалы», — адзначыў пісьменнік.

Нацыянальнай літаратурнай прэміі за найлепшы твор для дзяцей і юнацтва «Пашка і сонечны праменьчык» удастоена Алена Стэльмах. Найлепшы аўтар у намінацыі «Твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства» — крытык, кандыдат філалагічных навук Аліна Сабуць. Найлепшым дэбютам года прызнана Алеся Прыходзька з кнігай «Хлюпик и друг его Нюня». На Гомельшчыну адправілася яшчэ адна прэмія — за найлепшую кнігу паэзіі, яе ўладальніцай стала паэтэса і перакладчыца Соф'я Шах са зборнікам твораў «Дыядэмная споведзь: вянок вянкоў вянкоў санетаў».

Прывітальны адрас гасцям і ўдзельнікам Дня пісьменства даслаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка: «Шаноўныя сябры! Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства — святам нацыянальнай культуры, друкаванага слова і беларускай духоўнасці, якое сёлета адзначае 30-годдзе. За гэты час яго сталіцамі былі многія славутыя культурныя і асветныя цэнтры Беларусі, сярод якіх Полацк, Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Пінск, Заслаўе, Шклоў. З імі звязаны імёны лепшых айчынных творцаў сусветнага маштабу — Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Пятра Мсціслаўца, Спірыдона Собаля, Сімяона Полацкага. Сімвалічна, што юбілей прыйшоўся на Год міру і стваральнай працы і святкуецца на гасцінай Віцебшчыне, дзе нараджалася беларуская дзяржаўнасць і знаходзіцца старажытнейшы цэнтр кнігадрукавання. Родная мова, веды і традыцыі продкаў заўсёды яднаюць людзей, натхняюць іх на плённую працу, дазваляюць пераадольваць цяжкасці і перашкоды, з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай сілы і мудрасці народа, апорай у выхаванні патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны. Шчыра жадаю ўсім удзельнікам і гасцям свята здароўя, шчасця, жыццёвай мудрасці і творчага плёну на карысць Радзімы».

З галоўнай святочнай сцэны да прысутных звярнуўся старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін: «Віцебшчына ганарыцца сваёй гісторыяй, культурай, багатым духоўным скарбам. Старажытны Полацк, калыска беларускай дзяржаўнасці, малая радзіма ўсходнеславянскага і беларускага першадрукара, філосафа і гуманіста Францыска Скарыны. У 1994 годзе Полацк урачыста прымаў першы Дзень беларускага пісьменства. І сёння вобласць сёмы раз стала цэнтрам прыцягнення для ўсіх, хто любіць роднае слова, падтрымлівае і развівае нашу нацыянальную культуру. Вялікія асветнікі прыдзвінскага краю Ефрасіння Полацкая, Сімяон Полацкі, Язэп Драздовіч, Уладзімір Караткевіч, іншыя літаратурныя і грамадскія дзеячы, навукоўцы плённай працай і сваім талентам узбагацілі скарбніцу сусветнай цывілізацыі. Сталіцай Дня беларускага пісьменства ў 2023 годзе па праве стаў Гарадок — малая радзіма аўтара самай вядомай нацыянальнай паэмы XIX стагоддзя "Тарас на Парнасе" Канстанціна Вераніцына. Прыгоды Тараса называюць жамчужынай беларускай паэзіі, а вершаваныя радкі жывой мовы хутка разняслися на цытаты і сталі народнымі прымаўкамі. З Гарадком звязана жыццё вядомага беларускага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзіміра Скарынкіна. Традыцыйна ў пачатку чэрвеня ў Гарадку праходзіць свята народнай творчасці «Гарадоцкі Парнас». Ён збірае многа самабытных майстроў, а Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору — узорная ўстанова ў Беларусі па захаванні і развіцці нацыянальнай спадчыны. Сучасныя і мінулыя дасягненні з'яўляюцца кодам нацыі, стымулам на новыя здзяйсненні».

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Пісьменнікі на свяце.

Скульптурная кампазіцыя «БУКВАР».

Кніжны бум і фестывальныя разынкі

Цэлая пешаходная вуліца пераўтварылася ў літаратурны квартал, дзе разгарнулі павільёны вядучыя выдавецтвы краіны. Выдавецкі дом «Звязда» прэзентаваў на свяце альманах «Дзвіна. Віцебшчына літаратурная», падрыхтаваны Віцебскім абласным аддзяленнем СПБ, а таксама папулярную навінку з серыі «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» Уладзіміра Ліхадзедава — фотаальбом «Ад Віцебска да Полацка. Падарожжа ў часе». На стэндах «Звязды» былі прадстаўлены таксама паэтычны зборнік «Жаўрукі над Палессем», зборнік краязнаўчых нарысаў Аляксандра Карлюкевіча «Праз шкельца гісторыі», зборнік востраасюжэтнай псіхалагічнай прозы «Змена пароляў» ад Наталлі Канстанцінавай, кніга легенд і паданняў «Дзяўчына з замчышча» Уладзіміра Ягоўдзіка, а таксама некалькі дзясяткаў дзіцячых кніг.

Спецыяльна да свята выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла каляровую кнігу «Тарас на Парнасе». Выданне адметнае тым, што акрамя самой паэмы (яна выдадзена як у арыгінале, так і ў перакладзе на рускую мову аднаго з лепшых расійскіх перакладчыкаў Міхаіла Лазінскага), у зборніку таксама прадстаўлены главы з кнігі Генадзя Кісялёва аб аўтарстве паэмы, нялёгкіх пошуках гістарычнай праўды і шматгадовай адданасці даследчыка абранай тэме, культурным сувязям народаў-суседзяў. Адзін з раздзелаў выдання таксама прысвечаны Гарадоцкаму краязнаўчаму музею, які аказаў выдавецтву вялікую дапамогу ў краязнаўчых даследаваннях.

Выдавецтва «Беларусь» прэзентавала кнігу Ігара Марзалюка «Сімвалы беларускай вечнасці: гісторыя сімвалаў беларускай дзяржаўнасці», а яшчэ прапаноўвала гасцям і ўдзельнікам свята такія навінкі як «Генацыд беларускага народа», зборнік архіўных дакументаў, які расказвае аб злачынствах карнікаў на акупаванай тэрыторыі Мінскай вобласці «Без тэрміну даўнасці. Беларусь».

Да юбілейнага свята абнавілася інфраструктура горада, цэнтральны гарадскі сквер цяпер носіць назву «Вераніцынскі». У ім з'явілася кампазіцыя з нержавеючай сталі «Дрэва беларускага пісьменства» — на яго нанесены прозвішчы вядомых аўтараў, якія праславілі Гарадоччыну. Урачыста адкрылі ў скверы і скульптуру, прысвечаную «Буквару» — першай кнізе ў свеце, якая была выдадзена 405 гадоў таму. Аўтарам кампазіцыі стаў студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Ігар Сілка, які стварыў з бетону своеасаблівы літаратурны лабірынт. Упрыгожылі сквер і шэсць каменных скульптур, над якімі да свята ў Гарадку працавалі студэнты гэтай жа акадэміі.

На будынках сацыяльна-культурных устаноў горада з'явіліся радкі з несмяротнай беларускай класікі, а шматпавярховы жылы дом на цэнтральнай плошчы ўпрыгожыў мурал з выявамі гербаў гарадоў, якія ў розныя гады сустракалі Дзень беларускага пісьменства — гэтае месца стала самым папулярным для фатаграфавання на свяце.

На шматлікія інтэрактыўныя пляцоўкі запрашалі раёны Віцебшчыны: можна было не толькі азнаёміцца з традыцыйнымі рамёствамі, далучыцца да шляхецкіх танцаў, завітаць на радзіму самага высокага чалавека ў свеце Фёдара Махнова, але і завітаць у раёк — традыцыйную кірмашовую забаву і паглядзець на ажыўшую карціну «Гарадоцкі кірмаш».

Сталіцай XXXI Дня беларускага пісьменства стане горад Івацэвічы Брэсцкай вобласці, на цырымоніі ўрачыстага закрыцця вымпел свята старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына Палякова перадала старшыні Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандру Сароку.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

Адам Багдановіч і яго мастак

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, акрамя вывучэння жыцця і творчасці пісьменніка, пільную ўвагу надаюць яго асяродку — родным, блізкім, сябрам. У музеі сфарміраваўся вялікі фонд, звязаны з імем бацькі паэта, яго фатаграфіі, рукапісы, машынапісныя працы, публікацыі, мемуарыстыка, эпісталярная спадчына. Матэрыялы, якія тычацца Адама Ягоравіча Багдановіча, таксама захоўваюцца ў розных культурных інстытуцыях Беларусі і замежжа. Цікавая гісторыя тычыцца мастацкіх партрэтаў бацькі з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (Мінск, Беларусь) і Яраслаўскага мастацкага музея (Яраслаўль, Расія).

Яраслаўскі мастацкі музей. Партрэт А. Багдановіча работы Ф. Панкова. Ліпень 2023 года.

А пачалося ўсё ў 2019 годзе, калі Аляксандра Георгіеўна Ванькевіч, былая супрацоўніца Дзяржаўнага музея БССР (цяпер — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) перадала ў фонды Літаратурнага музея Максіма Багдановіча лісты, якія пісаў ёй з Яраслаўля ў 1960-я гг. зводны брат паэта Павел Адамавіч Багдановіч. У лістах узнімаліся пытанні перадачы ў фонды гэтага музея матэрыялаў з сямейнага архіва Багдановічаў, каля 50 каштоўных экспанатаў з архіва Багдановічаў былі перададзены на захаванне ў Беларусь.

Падчас камандзіроўкі ў Яраслаўль у ліпені гэтага года супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча дамовіліся аб сустрэчы з навуковым супрацоўнікам Яраслаўскага мастацкага музея, заслужаным дзеячам культуры РФ Нінай Галянкевіч. Ніна Паўлаўна дазволіла нам бліжэй пазнаёміцца з тым самым знакамітым партрэтам работы Ф. Панкова, за лёс якога так хваляваўся Павел Багдановіч. На сённяшні момант партрэт захоўваецца ў фондах музея, дэманструецца ў часовых выстаўках, інфармацыя пра яго будзе ў каталогу мастацкіх работ Ф. Панкова, які рыхтуецца Н. П. Галянкевіч.

Нашу ўвагу прыцягнула просьба Паўла Багдановіча да А. Ванькевіч аб пошуку партрэта яго бацькі. У лісце ад 20 мая 1965 года Павел Багдановіч пісаў: «У мяне да вас вялікая просьба — паспрабуйце як-небудзь актывізаваць пошукі партрэта майго бацькі, напісанага мастаком Панковым. Не пакідайце гэтага без сваёй увагі». Пытанне ўзнімалася і ў наступных лістах: «…буду спадзявацца, што пошукі партрэта бацькі ўвянчаюцца поспехам» (17 чэрвеня 1965 г.), «…я знайшоў адрас Вольгі Андрэеўны Панковай, які мы з вамі не маглі знайсці. Паведамляю вам яго: Малахаўка, Ленінградскай чыгункі, Рэйкавая, д. 11. Мне хацелася б, каб былі паскораныя пошукі партрэта бацькі» (30 ліпеня 1965 г.), «…мне думаецца, што пошукі партрэта бацькі працы мастака Панкова варта было б пачаць з перапіскі, даслаўшы ад імя музея лісты ў Малахаўку на імя Вольгі Андрэеўны Постнікавай-Панковай (па адрасе, які я вам паведамляў) і ў Саюз мастакоў РСФСР» (25 жніўня 1965 г.). Аляксандра Георгіеўна Ванькевіч у адказ паведаміла, што афіцыйны ліст за подпісам намесніка дырэктара музея па навуковай частцы адпраўлены на імя ўдавы мастака, але гісторыя працягу не мела.

Аляксандра Ванькевіч была не адзінай памочніцай Паўла Багдановіча ў пошуках мастацкай працы Фёдара Панкова. У лісце да стрыечнай пляменніцы Наталлі Глебаўны Кунцэвіч ён пісаў: «…прыцягваю людзей да пошуку выдатнага партрэта бацькі, напісанага мастаком Панковым» (17 красавіка 1965 г.). З просьбай аб дапамозе ў гэтым пытанні ён звярнуўся да Ніны Барысаўны Ватацы, галоўнага бібліёграфа Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, якая займалася зборам матэрыялаў пра жыццё і творчасць М. Багдановіча. Н. Ватацы падрыхтавала кнігу «Шлях паэта» (Мінск, 1975 год), у якую ўвайшлі матэрыялы пра паэта, успаміны і перапіска з Паўлам Багдановічам. Лісты былі апублікаваны са скарачэннямі, як аказалася, даследчыца апусціла менавіта тыя радкі, дзе былі просьбы аб пошуку мастацкага партрэта А. Багдановіча. Верагодна, гэта зроблена было па той прычыне, што пошукі партрэта Нінай Ватацы на той момант яшчэ працягваліся, і публікацыя магла б з'явіцца ў выпадку станоўчага выніку.

Поўны тэкст лістоў П. Багдановіча да Н. Ватацы падрыхтаваны супрацоўнікамі мінскага музея пісьменніка і апублікаваны ў зборніку «Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма Багдановіча. Сшытак 4» (Мінск, 2021). У лісце ад 5 красавіка 1965 года брат паэта паведамляе: «…у Дзяржаўны музей я пісаў: маскоўскім мастаком Панковым быў напісаны ў фарбах вялікі партрэт майго бацькі А. Я. Багдановіча. Партрэт выдатны і як партрэт і як твор жывапісу. Жонка мастака Вольга Андрэеўна Постнікава-Панкова не хацела да сваёй смерці развітвацца з гэтым партрэтам. Каб цяпер натрапіць на сляды гэтага партрэта, мне параілі звярнуцца па садзейнічанне да шматгадовага члена Саюза мастакоў СССР Суслава Дзмітрыя Сцяпанавіча. Мой зварот да яго вярнуўся назад за смерцю адрасата. Мне хацелася б прыцягнуць музей да пошуку гэтага партрэта. Мастак Панкоў жыў і памёр у канцы 30-х гадоў у Малахаўцы пад Масквой. Самому мне пры маёй слепаце цяжка займацца пошукам партрэта». У лісце ад 20 верасня таго ж года ён піша, што надае «вялікае значэнне» пошукам партрэта, якія вядзе Дзяржаўны музей, і просіць Н. Ватацы аб дапамозе.

Ф. І. Панкоў. Партрэтная замалёўка А. Я. Багдановіча. 1926 г. З фондаў БДАМЛМ.

Ніна Ватацы не змагла адшукаць партрэт Адама Багдановіча, у 1968 годзе Павел Адамавіч пайшоў з жыцця, не даведаўшыся пра лёс карціны. На шчасце, мастацкая праца Фёдара Панкова захавалася, цяпер гэта экспанат Яраслаўскага мастацкага музея. У 2019 годзе мы звязаліся з калегамі з гэтага музея, і Ніна Паўлаўна Галянкевіч, мастацтвазнаўца, старшы навуковы супрацоўнік, падрыхтавала падрабязную інфармацыю пра карціну Ф. Панкова «Партрэт Адама Багдановіча», а таксама паведаміла пра іншыя яго партрэты, якія захоўваюцца ў фондах.

Фёдар Іванавіч Панкоў (1889—1937) — рускі, савецкі мастак, родам з вёскі Сухаверхава Яраслаўскага павета. Большая частка яго жыцця была звязана з Яраслаўлем, дзе ён вучыўся, а пазней у гэтым горадзе працаваў. Захаваная творчая спадчына мастака — каля 270 работ, сярод іх ёсць жывапіс і графіка, пейзажы, нацюрморты, партрэты. Тацяна Фёдараўна Панкова, дачка мастака, ва ўспамінах так пісала пра яго манеру працы: «графічныя свае працы бацька рабіў лёгка і хутка, партрэты сяброў маляваў седзячы за сталом, за шклянкай гарбаты або седзячы ў крэсле падчас гутаркі». Фёдар Панкоў стаяў каля вытокаў Яраслаўскага мастацка-педагагічнага тэхнікума, дзе і пазнаёміўся з Адамам Багдановічам, які выкладаў у гэтай жа навучальнай установе гісторыю культуры.

Як паведаміла Ніна Галянкевіч, у фондах Яраслаўскага мастацкага музея захоўваецца пяць работ, на якіх намаляваны А. Багдановіч, яны перададзены ў дар музею дачкой мастака. У планах музея выдаць каталог мастацкіх работ Ф. Панкова, дзе будзе падрабязная інфармацыя аб кожным творы, таму дадзім толькі іх кароткую характарыстыку. У 1982 годзе ў Яраслаўскі мастацкі музей Тацяна Панкова перадала дзве работы: «Партрэт Адама Багдановіча» (палатно, алей, 1927—1928 гг.), эскіз-партрэт (папера, аловак, 1927). У 2007 годзе яна перадала ў музей яшчэ тры эскізы-партрэты, выкананыя ў розных тэхніках і з выкарыстаннем розных матэрыялаў (вугаль, крэйда, графітны аловак, чорны і каляровыя алоўкі). На двух работах маецца подпіс аўтара і дакладная дата — 13 красавіка 1927 года, дата яшчэ аднаго эскіза пад пытаннем — «1929 (?)». У біяграфічным артыкуле пра Фёдара Панкова Ніна Галянкевіч пісала, што «ў партрэтах мастак паўстае перад намі як выдатны псіхолаг і майстар, які валодае маляўнічай школай. У партрэце жывапіс заўсёды стрыманы, але эмацыянальны ў сваёй строгай каляровай градацыі».

Як аказалася, гэта не ўсе партрэты Адама Ягоравіча Багдановіча, зробленыя мастаком Фёдарам Панковым. І сёлета гісторыя мела працяг. Справа ў тым, што яшчэ адна партрэтная замалёўка бацькі класіка беларускай літаратуры захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, у складзе фонду «Багдановічы». Большая частка матэрыялаў з гэтага фонду (фатаграфіі, рукапісы, эпісталярый, прадметы побыту) паступіла ў 1960-я гг., у дар ад Паўла Багдановіча, у тым ліку і гэты графічны ліст. Мастак выкарыстаў просты аловак, намаляваў пагрудны партрэт Адама Ягоравіча ў профіль, у зімовым паліто. На малюнку ёсць надпіс «А.Я.Багдановіч. 1926 г.», ва ўліковых дакументах пазначана, што мастак не ўстаноўлены.

Падчас камандзіроўкі ў Яраслаўль у ліпені гэтага года супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча дамовіліся аб сустрэчы з навуковым супрацоўнікам Яраслаўскага мастацкага музея, заслужаным дзеячам культуры РФ Нінай Галянкевіч. Ніна Паўлаўна дазволіла нам бліжэй пазнаёміцца з тым самым знакамітым партрэтам работы Ф. Панкова, за лёс якога так хваляваўся Павел Багдановіч. Партрэт захоўваецца ў фондах музея, дэманструецца ў часовых выстаўках, інфармацыя пра яго будзе ў каталогу мастацкіх работ Ф. Панкова, які рыхтуецца Н. П. Галянкевіч. У сваю чаргу, мы паказалі Ніне Паўлаўне партрэтную замалёўку бацькі пісьменніка, арыгінал якой захоўваецца ў БДАМЛІМ, а копія — у фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Праз некалькі дзён пасля вяртання з камандзіроўкі мы атрымалі ліст з Яраслаўля, у якім супрацоўніца Яраслаўскага мастацкага музея піша: «Праглядзела малюнкі Фёдара Іванавіча Панкова. Сумненняў няма! Партрэт А. Я. Багдановіча, які Вы мне прывезлі (скан) створаны Ф. І. Панковым» (27 ліпеня 2023 г.).

Такім чынам, можам адзначыць наступнае: на сённяшні момант выяўлены адзін мастацкі партрэт і пяць партрэтных замалёвак Адама Ягоравіча Багдановіча. Яны захоўваюцца ў фондах Яраслаўскага мастацкага музея і Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Мастацкія работы звязаны з яраслаўскім перыядам жыцця А. Я. Багдановіча і працай у Яраслаўскім мастацка-педагагічным тэхнікуме. Партрэты выкананы рускім мастаком Фёдарам Іванавічам Панковым з натуры, у розных стылях і тэхніках, з выкарыстаннем розных матэрыялаў. Супрацоўнікамі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча будзе праводзіцца далейшая работа па выяўленні партрэтаў Адама Ягоравіча ў музеях Беларусі і замежжа, а таксама работа па атрыбуцыі выяўленых карцін.

Ірына МЫШКАВЕЦ
Фотаздымкі дасланы аўтарам

Дзе вырошчваюць крытыкаў?

У беларускай літаратурнай суполцы не раз агучвалася, што добрых крытычных артыкулаў і рэцэнзій вельмі мала; што колькасць добрых крытыкаў у нас недастатковая; што трэба развіваць гэтую разнавіднасць літаратурнай творчасці. Засталося зразумець — якім чынам яе трэба развіваць.

Можна ўбачыць, што крытыка ўсё часцей уключаецца ў склад літаратурных конкурсаў як адна з намінацый. З'яўляюцца нават літаратурныя конкурсы, цалкам крытыцы прысвечаныя. Аднак арганізатарам падобных конкурсаў хочацца задаць два пытанні: ці шмат работ вы атрымалі? ці высокай якасці была абсалютная большасць работ?

Мяркую, не памылюся, калі скажу, што на абодва пытанні адказ будзе «не». Літаратару-аматару лягчэй напісаць верш або прозу — і інтуітыўна ён можа зрабіць гэта таленавіта. Але інтуітыўна пісаць добрую крытыку не атрымаецца. Крытыка размяшчаецца на мяжы паміж навукай і мастацтвам, гэта від літаратурнай творчасці, заснаваны на аналізе твора і яго месцы ў літаратурным працэсе. І каб напісаць добры артыкул ці рэцэнзію, трэба валодаць пэўнымі навыкамі:

1) Добрая «начытка». Аналіз тэксту заўсёды замыкаецца на жанр. На папярэднікаў у гэтым жанры. На тое новае, што аўтар здолеў адлюстраваць у межах жанру. Менавіта жанр твора намякае — чаго чытач можа чакаць ад твора. А ў нашу эпоху падзяленне на жанры стала абсалютным і ўсёмагутным. І калі перад вамі ляжыць раман у жанры сатыры-антыўтопіі, а вы пачынаеце крытыкаваць яго за нерэалістычнасць — адразу праваліліся на крытычнай ніве. Але чалавек, які чытае шмат і ў розных жанрах, мае добры літаратурны ахоп, разумее заканамернасці літаратурных твораў — такі чалавек мае шанцы добра прааналізаваць любы тэкст.

2) Здольнасць паставіць аналітыку над эмоцыямі. Часам крытыкі, у тым ліку і самыя вядомыя, паддаваліся парыву эмоцый і адводзілі тэкст у «падабаецца — не падабаецца». Той жа Бялінскі, «апантаны Вісарыён» — настойліва стараўся падагнаць усе бачаныя ім тэксты пад жанр крытычнага рэалізму, прыпадабняючыся пры гэтым да антычнага Пракруста з яго ложкам. Зразумела, на крытыка заўсёды будуць уплываць і яго выхаванне, і час, і асяроддзе, і, зразумела, асабісты густ, бо крытыкі — таксама людзі! Аднак усё ж сысці ў чыстую «смакоўшчыну» крытык не мае права. Калі тэкст дрэнны — трэба разабраць, што ў ім дрэнна. І пажадана сваю думку пацвердзіць цытатамі. Калі тэкст добры — глядзі вышэй.

3) Уменне не проста чытаць тэкст, але чытаць яго як след. Неразуменне сэнсу тэксту, няўвага да дэталяў, якія прапануе нам аўтар, «прыдумлянне» за аўтара таго, чаго ён не казаў і не думаў, — сур'ёзная хвароба сучаснай крытыкі. А чалавек, які хоча пісаць літаратурна-крытычныя артыкулы, павінен развіць у сабе не проста культуру чытання, але звышкультуру: прыкмячаць дробязі, звязваць разрозненыя дэталі разам, бачыць аўтарскія прыёмы...

4) Уменне выказваць свае думкі на прымальным узроўні. Гэта не толькі пісьменнасць і здольнасць выкладаць меркаванні больш ці менш зразумела. Гэта яшчэ і наяўнасць свайго стылю, аўтарскага почырку, які бывае ў пісьменнікаў ці журналістаў. Літаратурная крытыка не павінна быць чымсьці прызначаным выключна для інтэлектуальнай эліты або навуковых колаў. Яе павінны разумець усе, хто цікавіцца літаратурай. Менавіта таму не заўсёды атрымліваецца крытыка якраз на ўладальнікаў навуковых ступеняў. З-за гэтага яны часцей факусіруюцца на дробных дэталях твора, і ім бракуе дыханне літаратуры — метафарычнасці і жвавасці.

А цяпер паразважаем, чаму ж узрасціць крытыка «з нуля» не атрымаецца. Хто можа ўдзельнічаць у конкурсах, пра якія мы казалі вышэй? Студэнты і школьнікі? Але ў іх часта неразвітая культура чытання, не кажучы ўжо пра тое, каб мець дастаткова шырокую начытку.

Тады можна паспрабаваць уключыць у літаратурна-крытычны працэс больш навукоўцаў? Нягледзячы на праблемы, якія мы вызначылі вышэй, — ідэя нядрэнная. Гаворка ідзе пра дарослых людзей з вялікім вопытам чытання, і да гэтага дадаюцца аналітычныя здольнасці і ўменне аргументаваць — бо ўсё гэта неабходна ў навуцы. Пры пэўнай практыцы і ад праблем з навуковым стылем, хутчэй за ўсё, атрымаецца пазбавіцца. Аднак навукоўцы, выкладчыкі звычайна плённа працуюць над лекцыямі, экзаменамі і напісаннем навуковых артыкулаў. Ці знойдзецца ў іх час на тое, каб дадаць да сваёй і без таго высокай нагрузкі яшчэ і літаратурна-крытычную працу? Магчыма, частковым выхадам можа стаць

арганізацыя не навуковых, а літаратурна-крытычных канферэнцый, створаных «па мадэлях» канферэнцый навуковых. Гэта значыць, з арганізацыйнымі зборамі і публікацыяй рэцэнзій і літаратурных артыкулаў у зборніках па выніках канферэнцый, а таксама ўключэннем найбольш цікавых артыкулаў у аўтарытэтныя рэспубліканскія выданні. У такім выпадку навукоўцы будуць зацікаўлены ў тым, каб хоць бы зрэдку звяртацца менавіта да працы літаратурна-крытычнай.

Застаюцца, вядома, яшчэ журналісты, бо літаратурна-крытычныя артыкулы часцей за ўсё блізкія менавіта да публіцыстыкі. Аднак часам у журналістаў пры напісанні рэцэнзій не хапае літаратурнага вопыту — ведаў літаратурнага працэсу, — для таго каб выканаць сапраўды глыбокі і цікавы разбор твора. У выніку мы атрымліваем альбо канстатацыю фактаў без высноў (і гэта падобна да вельмі вялікай анатацыі), альбо рэкламу твора — што, вядома, нядрэнна, але да жанру літаратурнай крытыкі адносіцца вельмі ўмоўна. Зноў жа — паспяховыя выключэнні ёсць, і гэта неверагодна радуе.

У такім выпадку атрымліваецца, што на ідэі абзавесціся новай плеядай добрых крытыкаў трэба паставіць крыж? Зусім не: мы казалі толькі пра немагчымасць вырасціць крытыкаў з нуля — зацікавіць літаратурна-крытычнай творчасцю тых, для каго гэта не з'яўляецца натуральным. Але гадамі, дзесяцігоддзямі і нават стагоддзямі крытыку пісалі зусім не навукоўцы, студэнты ці журналісты (вядома, і яны таксама, але...). Большая частка крытыкі пісалася літаратарамі — пісьменнікамі!

Чаму ў нашай свядомасці вобраз пісьменніка і вобраз крытыка настолькі несупастаўныя? Чаму мы падзяляем тых, хто піша, і тых, хто аналізуе? Магчыма, таму, што са школьнай лавы нам памятаюцца вобразы Бялінскага, Дабралюбава і Пісарава — памятаюцца менавіта як вобразы прафесійных крытыкаў, якія не звярталіся да іншых літаратурных жанраў.

Але Дабралюбаў быў не толькі крытыкам, але і публіцыстам, і паэтам. Бялінскі быў публіцыстам і спрабаваў пісаць драмы. А Пісараў, акрамя публіцыстыкі, займаўся яшчэ і літаратурнымі перакладамі! І ў любым выпадку, падзяляць літаратараў і крытыкаў толькі з-за гэтай вялікай тройкі або толькі з-за крытыкаў сярэдзіны XIX стагоддзя недальнабачна. Крытыка тых часоў была ўнікальнай з'явай: у ёй гучалі сацыяльныя пытанні, якія цэнзура б не прапусціла ў артыкулы нелітаратурныя.

Аднак дзесяцігоддзямі складвалася тэндэнцыя, калі менавіта знакамітыя літаратары выказвалі свае погляды на творы сучаснікаў ці нават наогул на літаратурны працэс. Водгукі і рэцэнзіі пісаў Пушкін. Дастаеўскі выдаваў часопіс «Дневник писателя», дзе дзяліўся сваімі поглядамі ў тым ліку і на літаратуру таксама. І Леў Талстой, і Тургенеў, і Некрасаў так ці інакш былі ўключанымі і ў крытычны літаратурны працэс. Пяройдзем да пісьменнікаў Сярэбранага веку — і выявім, што многія з іх удзельнічалі у літаратурных палеміках, пісалі маніфесты, артыкулы, фельетоны... літаральна жылі ў літаратурна-крытычным працэсе. Калі ж зірнуць на савецкі перыяд літаратуры — то актыўны ўдзел у такім працэсе стаў для пісьменнікаў, мабыць, і абавязковым. Адшукаць аўтара, які не напісаў бы ніводнага водгуку, ні адной рэцэнзіі, артыкула, можна толькі з вялікай цяжкасцю.

Дык чаму ж цяпер мы страцілі гэтую сувязь з крытыкай, чаму сучасныя пісьменнікі сталі толькі на пазіцыі творцаў — але забыліся пра другі бок літаратурнай творчасці?

Магчыма, часткова гэта адбываецца таму, што пісьменнікі XVIII—XIX стст. жылі за кошт ганарараў або дзяржаўнай падтрымкі. Літаратура была для іх працай у прамым сэнсе гэтага слова, а крытыка — часткай гэтай працы. У пісьменніка сучаснага часта літаратура стаіць на ўзроўні хобі ці неабавязковага другараднага даходу. Паняцце «прафесійны літаратар» даўно размылася, і даўно тым, хто ўступае ў шэрагі творчых саюзаў, не даюць тэарэтычнай дадатковай падрыхтоўкі накшталт літаратурных курсаў пры інстытуце (як гэта было ў савецкія часы)... а значыць, і магчымасцей для напісання крытыкі ў сучасных пісьменнікаў куды менш. Аднак магчымасці гэтыя застаюцца. І, больш за тое, «вырошчваць» крытыкаў можна як след толькі з пісьменнікаў!

«Ну не! — запярэчаць мне тут творчыя калегі словамі Пушкіна. — *"Мы рождены для вдохновенья, для звуков сладких и молитв!"* Мы тут на сцежку Бялінскага не падпісваліся! Мы не ўмеем! Мы не можам!» У адказ хочацца задаць цалкам няўміннае пытанне: не можаце чаго? Чаго такога не хапае сучаснаму пісьменніку, што ён не можа напісаць — няхай не крытычны артыкул, але разумны водгук ці рэцэнзію?

Можа быць, нашым аўтарам не хапае начыткі? Але паверыць у такое —значыць абразіць беларускіх пісьменнікаў. Пісьменнік сапраўдны проста абавязаны чытаць хай нават не вельмі шмат, але ўвесь час — інакш ён страціць сваю каштоўную сувязь з літаратурай і пачне дэградаваць як аўтар.

Тады, можа быць, няўменне чытаць? Зноў не. Як можа напісаць добры тэкст аўтар, які не разумее чужыя тэксты, не ўмее ў іх учытвацца?

Дык, можа быць, нашы аўтары не ўмеюць нармальна выказваць думкі? Гэта і зусім мяжуе з абсурдам. Уменне выказваць меркаванне пра творы нам даюць яшчэ ў школе. І глупства — думаць, што ў сапраўднага пісьменніка гэта ўменне не спрагрэсіравала да прыстойнага водгуку або рэцэнзіі.

Магчыма, некаторую цяжкасць уяўляе неабходнасць вытрымаць баланс паміж эмоцыямі і аналізам тэксту. Пісьменнікі — народ эмацыйны, і ім бывае цяжка не аддацца эмоцыям хай нават і ў крытычным артыкуле. Але гэта «лечыцца» ўзорамі, якімі поўны інтэрнэт!

Такім чынам, калі ў нас пакуль што няма мноства чытачоў, якія жадаюць дадаць рэцэнзіі ў беларускі літаратурны працэс, — застаецца чакаць гэтага ад саміх літаратараў. Калі мы выходзім з думкі, што нашы аўтары — прафесіяналы, а не аматары, то літаратурная крытыка — гэта крок, які ім давядзецца зрабіць у далейшым. Калі мы лічым, што ў нас не гурток па інтарэсах, а творчае аб'яднанне, якое вызначае літаратурны працэс у краіне, — то ўдзельнікам аб'яднання прыйдзецца ўключыцца ў гэты працэс цалкам.

Дададзім да нашых разваг крыху матэматыкі. Няхай адзін аўтар напіша адзін літаратурна-крытычны твор у год. Гэта можа быць рэцэнзія на ўпадабаны твор, водгук на творчасць сучасніка, артыкул аб якім-небудзь літаратурным працэсе і з'яве — усё што заўгодна, актуальных тэм не злічыць. Колькі ў СПБ актыўных аўтараў? Больш за сотню, у любым выпадку. Але няхай з гэтым невялікім заданнем справіцца сотня. Хіба гэта не той прарыў у крытыцы, пра які ішла гаворка?

Так, магчыма, цяжка будзе змагацца з кампліментарнымі рэцэнзіямі па прынцыпе «зязюля хваліць пеўня...». Так, можа быць, завяжуцца літаратурныя дыскусіі па яшчэ больш крыўдным прынцыпе: «Ты мой тэкст пакрыўдзіў?! Дык і я твой разнясу!» Так, можа быць, прыйдзецца паднапружыцца і рэдактарам, і карэктарам. Можа, напрыклад, калі водгук на твор негатыўны — давядзецца публікаваць разам пазітыўны водгук як два погляды на твор. Можа быць, неабходнымі будуць семінары, прысвечаныя крытыцы, ці нешта накшталт цыкла артыкулаў «Як рабіць крытыку» — падобна да Маякоўскага, які пісаў «Як рабіць вершы». Але ёсць верагоднасць, што ў літаратурную крытыку прыйдуць новыя імёны. Што яна ўзбагаціцца.

Магчыма, я занадта схільная да правіл навуковай суполкі, дзе даўно не здаецца чымсьці ганебным напісаць у плане на год «два артыкулы ў рэцэнзуемых часопісах, удзел у пяці канферэнцыях са зборнікамі тэзісаў». Але адзін артыкул у год ад чалавека — у сярэднім тры старонкі — не здаецца мне вялікай цаной за тое, каб беларуская крытыка пачала сваё адраджэнне.

Таму на пытанне «Дзе вырошчваюць крытыкаў?» я адкажу... мабыць, трохі анекдатычна, таксама пытаннем. Ці нават некалькімі пытаннямі.

Адзін артыкул у год ад пісьменніка — ці ж гэта шмат? Тры старонкі — ці ж гэта так страшна? Ці трэба кагосьці наогул вырошчваць, калі ў нас такая база?

Бярыцеся за пёры, спадары пісьменнікі. Бярыцеся за пёры і аддайце нашай крытыцы хоць бы тры старонкі ў год.

Алена КІСЕЛЬ, кандыдат філалагічных навук

Архівы вучаць думаць загадзя

Распачынае жнівеньскі нумар часопіса «Полымя» паэтычная нізка Генадзя Пашкова «У памяці маёй». Прастора мінулага нярэдка пачынае вабіць чалавека па меры разгортвання жыцця: так псіхіка, відаць, прымушае нас зразумець незразуметае, пражыць непражытае, адчуць тое, што выслізнула, а можа, і было адрынута як нявартае ці непатрэбнае. Аўтар перабірае ў думках цаглінкі, што склалі падмурак яго свядомасці. Адначасова па-мастацку ўвекавечваецца тое, на чым не толькі генетычна, але і светапоглядна, духоўна і культурна ўзрастаў чалавек і творца.

Вызначальнай для Г. Пашкова выступае блізкасць з роднымі людзьмі (як папярэднікамі, так і наступнікамі): асалода еднасці з імі мільгае ў вершаваных радках. «*Вочы азярцовыя... і рукі — гэта радаслоўная мая!*» — з гонарам гаворыць аўтар у адным з твораў. Светапоглядныя карані паэта ахопліваюць не толькі яго малую радзіму ў абліччы роднага дому, бацькоўскіх магіл, цёплага вобраза маці. Паэт імкнецца выявіць у творчасці і свядомасць радзімы вялікай, якой, напрыклад, была хрысціянская традыцыя ў жыцці ўсяго беларускага народа. А гледзячы ў неспазнавальнае жнівеньскае неба з расцягнутымі там прыгожымі зіхатлівымі гірляндамі, лірычны герой думае яшчэ і пра месца чалавека і чалавецтва ў іх касмічнай радзіме — Сусвеце:

І я ўвесь, прасветлены, без ценю,
у сяйве шматміліярдных зор
думаю пра наша атачэнне —
гэткае бязмернае вакол!

Працягвае друкавацца распачаты ў ліпеньскім нумары раман-версію Уладзіміра Гаўрыловіча «Любі бліжняга твайго...». Назва апелюе да выверaных часам біблейскіх запаветаў, але ўся яе глыбіня цалкам не раскрылася. Далейшыя перыпетыі жыцця няпростага героя, вобраз якога выступае ключавым у папярэдніх частках, пакуль яшчэ застаюцца невядомымі: на першы план выходзяць іншыя асобы. У той час як прастора дзеяння застаецца нязменнай, аўтар працягвае абазначаную раней гульню часавымі пластамі: сучасныя падзеі ў Беларусі, паказаныя ў вялікім, дзяржаўна-гістарычным ахопе, перагукаюцца з трагічнымі старонкамі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама больш даўнім перыядам — міжусобных войнаў XI ст. Злучальнымі звёнамі гэтых пластоў выступаюць раманы, аўтарам якіх у творы выступае адзін з герояў — Яўген Кавенька. Заўсёды інтэлектуалы спрабуюць знайсці адказы на надзённыя пытанні ў прасторы нацыянальнага мінулага, заручыцца яго падтрымкай, і наш час — не выключэнне.

Аліна Легастаева ў невялікай паэтычнай нізцы «У дарозе лёгка думаць» закранае розныя тэмы, а апошнія два вершы яднае экзістэнцыяльная праблематыка. Яна выяўляецца ў матыве адзіноты чалавека і непазбежнай канчатковасці яго жыцця на зямлі, дзе многае, нават сцяна, перажыве цябе. Свядомасць аўтаркі, сталай жанчыны, вызначае разуменне быцця — згода і з адзінотай, і са сваёй часовасцю ў свеце, дзе ты выступаеш прамежкавым звяном нечага большага: «*Жыццё ва ўнучках пабяжыць // І будзе ўсё як трэба*». Здольнасць убачыць у гэтым нешта вартае і добрае — паказчык сталасці асобы паэткі, якая не стамляецца рэфлексаваць над быццём асобы ў свеце.

Аляксандр Быкаў назваў сваё апавяданне «Кропка сінгулярнасці», выкарыстаўшы папулярнае сёння паняцце, змест якога з'яўляецца даволі абстрактным для звычайнага чалавека. У творы разгортваецца гісторыя лёсу мужчыны, магчыма, блізкага аўтару, які, як і галоўны герой, працаваў журналістам. Жыццё ставіць перад Міколам пытанні, але не спяшаецца даваць адказы, хоць яны ўяўляюцца прынцыповымі: напрыклад, жывы ці мёртвы бацька героя? У творы пануе атмасфера прадвызначанай выпадковасці таго, што з чалавекам адбываецца на шляху: усё важна, але разам з тым і не мае значэння ў абставінах невядомасці будучыні і бязмэтнасці асэнсавання, згодна з законамі той самай сінгулярнасці.

А законы жыцця, на жаль, няўмольныя. І сыходзяць дарагія людзі ў іншы свет. А тут аб іх застаецца памяць — творы. У прыватнасці байкі Георгія Марчука. Яго героі ў пераважнай большасці традыцыйныя для абранага жанру — гэта жывёлы і птушкі, зручныя для выяўлення адвеку замацаваных за імі пэўных чалавечых якасцей. Шэраг прадстаўленых у падборцы твораў уяўляюць сабой асучасненыя перастварэнні добра вядомых нам баек («Варона і лісіца») ці проста перагукаюцца з тэкстамі рускага байкапісца («Ансамбль») Івана Крылова.

У рубрыцы «Меркаванне» Уладзімір Паўловіч тэкстам «Буквіцы і два выбітныя творы Францішка Скарыны: тытульны ліст да "Бібліі Рускай" і аўтапартрэт» нагадвае чытачу пра маштаб асобы і дзейнасці беларуса сусветнага ўзроўню. Аўтар артыкула пралівае святло на некаторыя факты жыцця і творчасці першадрукара, а разам з гэтым паглыбляе ў атмасферу і абставіны часу, у які той жыў і які непадрыхтаванаму сучаснику няпроста ахапіць розумам.

Ёмістая навуковая публікацыя Міколы Мікуліча «"З сяўнёю, поўнаю зярнят..." Творчая індывідуальнасць Міхася Машары» знаёміць са спадчынай запатрабаванага ў Заходняй Беларусі 1930-х гг. літаратара. Міхась Машара працаваў у розных жанрах і нават быў папулярным, але аўтар артыкула, спецыяліст у галіне паэзіі, засяроджваецца на аналізе вершаў і толькі закранае драматычныя творы і празаічную трылогію. Сёння пра літаратара памятаюць нямногія, хоць і ў яго вершах можна адшукаць жамчужыны. Каштоўная спадчына М. Машары і адлюстраваннем грамадскіх, палітычных, культурных працэсаў, таму, безумоўна, вартая ўвагі чытача і даследчыка.

Казімір Камейша працягвае распачатыя ў ліпеньскім нумары ўспаміны «Па літфондаўскай пуцёўцы» пра свой побыт у Каралішчавічах. Прыгадваюцца згадкі калег па пяры пра розных літаратараў, напрыклад, Якуба Коласа. Класік частаваў дзяцей цукеркамі, што пацвярджае яго любоў да малых і маленства, па-мастацку засведчаную ў творах і чытанцы. Ва ўспамінах гаворыцца пра той каштоўны духоўны ўзаемаабмен, які адбываўся паміж літаратарамі рознага ўзросту ў Каралішчавічах: «*У сваім пакаленні неяк не ўсталяваліся мы, амаль не знайшлі аднасардэчнасці і ўзаемапаразумення і таму, магчыма, усёй душой цягнуліся да пакалення франтавікоў. Там было чаму павучыцца. Яны дапамагалі нам сталець, мы дапамагалі ім заставацца маладымі ці вяртаць сваю маладосць, пакінутую на вайне*». Побыт у Доме творчасці быў карысны аўтарам з пункту погляду не столькі прадукцыйнасці (многія з іх там не надта шмат і пісалі), колькі ў плане абмену думкамі і ідэямі, цесных зносін з аднадумцамі свайго і іншага ўзросту, не меней значных і важных у справе, чым непасрэдна пісанне.

Сяргей Слонімскі распавядае пра беларускага «Пушкіна, які сябраваў з Караткевічам і Барадуліным», са спадзяваннем не толькі распаўсюдзіць веды пра малавядомага пісьменніка і журналіста, але і ўзбагаціць іх, — калі ўдасца выйсці на сваякоў ці людзей, якія валодаюць нейкай новай інфармацыяй. З публікацыі можна даведацца, што Яўген Пушкін кантактаваў з Уладзімірам Караткевічам, які стаў аўтарам прадмовы да яго зборніка апавяданняў і мініяцюр, хоць гэты факт чамусьці не згадваецца нідзе ў даведніках. У цёплых адносінах быў літаратар і з сям'ёй Рыгора Барадуліна: С. Слонімскі расказвае, як аднойчы, не знайшоўшы іншай магчымасці, Я. Пушкін эфектна прыехаў у цэнтр горада ўручыць жонцы паэта кветкі на дзень нараджэння на бронетранспарцёры.

Вячаслаў Селяменеў і Мікола Берлеж знаёмяць з дакументамі дзяржаўных архіваў у публікацыі «Прапанова аб стварэнні творча-вытворчай асацыяцыі». Аўтары расказваюць пра тое, як у 90-я гг. інтэлігенцыя — вядомыя нам усім работнікі сферы навукі і культуры — намагаецца палепшыць стан важных для нацыянальнага жыцця галін кнігавыдання і кнігагандлю. Добрыя і сур'ёзныя пытанні былі пастаўлены перад кіраўніцтвам, аднак, мяркуючы па выніках, зварот быў разгледжаны павярхоўна. У іншым выпадку, «*можа быць, і рэчаіснасць айчыннага кнігавыдання ў наступныя дзесяцігоддзі таксама была б іншая*».

Публікацыя скіроўвае да разваг пра тое, што нашы папярэднікі ўмелі думаць загадзя, чаму ў іх можна было б і павучыцца. Сённяшняя лічбавізацыя тэкставай прадукцыі, а дзесьці і перавага выкарыстання кніг у электронных фарматах абавязвае і нас думаць загадзя на дзяржаўным узроўні, напрыклад, пра фарміраванне для карыстальнікаў электроннай базы нацыянальнай класікі, пра магчымасць набыцця спажыўцамі лічбавых версій выданняў. Папяровая кніга не знікне, але не ўлічваць агульны кірунак развіцця грамадства было б памылковым, як і супраціўляцца яму. Сённяшнія, засвоеныя заўсёды больш чуйным да змен бізнесам тэндэнцыі ў тых жа сферах кнігавыдання і кнігагандлю абумоўлены сур'ёзнай — упершыню пасля вынаходніцтва друкарскага станка — інфармацыйнай рэвалюцыяй, звязанай з укараненнем электронных сродкаў для пісьма і чытання.

У рубрыцы «Меркаванне» Уладзімір Паўловіч тэкстам «Буквіцы і два выбітныя творы Францішка Скарыны: тытульны ліст да "Бібліі Рускай" і аўтапартрэт» нагадвае чытачу пра маштаб асобы і дзейнасці беларуса сусветнага ўзроўню. Аўтар артыкула пралівае святло на некаторыя факты жыцця і творчасці першадрукара, а разам з гэтым паглыбляе ў атмасферу і абставіны часу, у які той жыў і які непадрыхтаванаму сучаснику няпроста ахапіць розумам. Як даводзіць У. Паўловіч, прапаноўваючы разгадкі таямніц і цікавыя прачытанні манументальнай спадчыны асветніка,

культурнымі кодамі і універсальнымі спосабамі ўзаемадзеяння ў асяроддзі адукаваных людзей тады былі сімволіка і рэбус. Менавіта яны ў перыяд Адраджэння выкарыстоўваліся не толькі ў рукапіснай і друкаванай літаратуры, але і ў перапісцы інтэлектуалаў, будучы прыкметай добрага тону, высокага густу.

На гэтым фоне хіба што іронію выклікае тое, што сёння замест сімвалаў і рэбусаў ці нейкіх іншых інтэлектуальных гульняў нашу пісьмовую камунікацыю суправаджаюць смайлікі з замацаваным за імі адназначным зместам. Болей за тое, цяпер іх адсутнасць у прыватнай перапісцы здольна для некаторых стаць падставай для абвінавачання суразмоўцы ў «сухасці», безэмацыянальнасці.

Ёмістая навуковая публікацыя Міколы Мікуліча «"З сяўнёю, поўнаю зярнят...". Творчая індывідуальнасць Міхася Машары» знаёміць са спадчынай запатрабаванага ў Заходняй Беларусі 1930-х гг. літаратара. Міхась Машара працаваў у розных жанрах і нават быў папулярным, але аўтар артыкула, спецыяліст у галіне паэзіі, засяроджваецца на аналізе вершаў і толькі закранае драматычныя творы і празаічную трылогію. Сёння пра літаратара памятаюць нямногія, хоць і ў яго вершах можна адшукаць жамчужыны.

У «Кнігарні» рэцэнзіі на дзве свежыя, бягучага года кнігі: адна з іх навуковая, другая — мастацкая. Таццяна Шамякіна ў публікацыі «Жывятворныя крыніцы літаратурнай класікі» робіць агляд выдання В. Максімовіча «Эстэтыка творчасці Максіма Багдановіча». Даследчыца адзначае наватарскі характар кнігі, напісанай з заглыбленнем у філасофію, эстэтыку, культуралогію, псіхалогію творчасці. Гэта надае рабоце міждысцыплінарны характар, здольны адкрыць новыя рэцэптыўныя пласты ў асэнсаванні нацыянальнай класікі перыяду Адраджэння пачатку XX ст. Т. Шамякіна адзначае здзейснены аўтарам выдання — з апорай на зроблены У. Конанам задзел — сістэмны аналіз мастацкай і крытычнай спадчыны М. Багдановіча.

Другая рэцэнзаваная кніга — складзены Алесем Карлюкевічам зборнік аповесцей беларускіх аўтараў «Дараванне», першы ў распачатай выдавецтвам «Аверсэв» серыі «Сучасная беларуская літаратура». Таццяна Сідарава ў агляде «Шляхамі ісціны: праз свет беларускай прозы» паказвае, як нацыянальнае ў мастацтве становіцца універсальным, адзначае «наднацыянальнасць» твораў, звяртаючыся да кантэксту класічнай рускай літаратуры. Рэцэнзент засяроджваецца на некалькіх тэкстах, з апорай на якія дапамагае чытачу сарыентавацца ў характары прадстаўленых мастацкіх твораў, — аповесці Алены Брава, якая дала назву зборніку, і «Геніі» Алега Ждана.

Наталля БАХАНОВІЧ

«Не спыняйся ніколі — свяці!»

«Выток» — народны літаратурны клуб, які працуе пры Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы пад кіраўніцтвам Наталлі Іванаўны Лебядзеўскай. Яго ўдзельнікі — творцы рознага ўзросту і розных прафесій — актыўна ўдзельнічаюць у літаратурным жыцці раёна і краіны, ладзяць творчыя сустрэчы, прэзентацыі новых кніг, адзначаюць літаратурныя святы… Сярод удзельнікаў тры члены Саюза пісьменнікаў Беларусі — Людміла Круглік, Антон Анісовіч і Барыс Савінаў. Мэта «Вытока» — падтрымка таленавітых паэтаў, папулярызацыя іх творчасці, развіццё літаратурнай дзейнасці на Дзяржынчыне.

Рагнед МАЛАХОЎСКІ

Ядвіга ДОЎНАР

Жнівеньскае развітанне

Выплакала воблачка ўсе вочы
І на дзень пазбавілася слёз,
Жнівень па расе няспешна крочыць
У абдымках клёнаў і бяроз.

Ды замкне ён хутка ў лета дзверы,
І на год схавае ў куфар ключ,
Зладзіць спрытна з туманоў шпалеры,
Упрыгожыць дываном зямлю.

Лёгкай павуцінкай-выцінанкай
Жнівень наваколле ахіне,
Верасень сустрэне ясным ранкам
І слязінкі лісцейкам змахне...

Алена НОВІК

Мой май

Кінуў долу яркае адзенне
Жартаўнік-гарэза месяц май.
Ты — маё вясновае трызненне,
Мае думкі, боль мой і адчай.

Ты — маё каханне без прызнання,
Пацеры, сказаныя без слоў.
Ты — мая надзея без чакання
Лёсу, напісанага наноў.

Белыя пялёсткі на сцяжынках…
Як мне адшукаць твае сляды?
Шчасце тонкай ніткай-павуцінкай
Нас з табой злучыла назаўжды.

Думкі разлятаюцца ў імгненне…
Зменіць чэрвень цёплы месяц май…
Ты — маё жыццёвае трызненне,
Смутак мой і вечны мой адчай.

Наталля ЛЕБЯДЗЕЎСКАЯ

Вясенні настрой

Ці можна распавесці пра вясну,
Што ціхай песняй у душу трапляе,
Што сапраўды нас пазбаўляе сну,
Што надае нам моц і акрыляе?!

І снег, што ў снежні страсна захапляў,
Цяпер міжволі сее раздражненне.
Раўчук, які жыццё з яго пачаў,
Ужо мне больш прыносіць захапленні!

Яго адвазе, смеласці падчас
Зайздрошчу. І з'яўляецца жаданне
Зрабіць, як ён: змяніць свой шлях ураз,
Нягледзячы на ўсе выпрабаванні.

Дык, прэч той снег, і той, хто замінае,
Той, хто не любіць так жыццё, як я,
Той, хто не разумее, не кахае!
Як снег вясной, сыдзі з майго жыцця!

Антон АНІСОВІЧ

Сасна

Калі аднойчы я пакіну свет
І буду там, дзе цемра днём і ноччу,
Пакуль не спарахнее мой шкілет,
Пакуль не спяць заплюшчаныя вочы,

Я буду прабівацца праз труну,
Праз пласт зямлі халоднае магілы,
Растком сасны святла я дасягну.
Яна ў жыцці мне надавала сілы.

І той, хто прыйдзе мой наведаць прах,
А там сасну, а не граніт убачыць.
Знай! Перамог я смерць сваю і страх —
Працягваю жыць дрэвам гэта значыць!

Барыс САВІНАЎ

Вярнуцца

Жыццё хацеў я паўтарыць,
Вярнуцца да сваіх пенатаў,
Ды двойчы не магу любіць
Той экскурс яўна пуставаты.

Вярнуцца ў тое, што ўцякло…
Ужо няма тае рачулкі,
Гадоў зашмат ужо сплыло.
Адказ, нібыта груз той мулкі.

Ці варта ўжо назад глядзець,
Сябе карыць за ўсё ці варта?
Лепш з ранкам новым разам днець
І крочыць з поспехам у заўтра.

Пераклад з рускай Рэгіны РЭЎТОВІЧ

Людміла КРУГЛІК

Званы Хатыні

Вечнасць жорсткасцю ліхалецця
Запрашае ў вёску Хатынь.
Там у полымі плачуць дзеці.
Пакаранню няма прычын.

Дзьме па полі сівы вятрыска,
Гоніць попел і чорны дым.
Дагарае дзіця ў калысцы…
Быў ЛітАвец на месцы тым.

І ад гора пульсуе сэрца
Гулкім рэхам, па целе набат…
Прад вачыма полымя смерці
Толькі коміны замест хат.

За малую сястру, за брата,
Што не зведалі водар вясны
Уздымаюцца болем страты
Над Хатынню званы… Зва — ны!

Чуеш звон, чалавек Сусвету,
Што па небе нясуць жураўлі…
Знойдзем разам міру сакрэты,
Будзем сад расціць на зямлі.

Алена ЯНКОЎСКАЯ

Продак-волат

Продак-волат, ты абарані нас
Ад нячыстай сілы і нягод.
Той, хто пад тваёй аховай вырас —
Смела крочыць у любы паход.

Продак-волат, зберажы ты дзетак
Ад трывог сучаснай злыбяды,
Каб маглі яны з букетам кветак
Да цябе прыходзіць на Дзяды.

Каб з любоўю, а не з лютым страхам
Углядацца ў вечнасці блакіт,
І пад кожным беларускім дахам
Панаваў каб мір і дабрабыт.

І сваіх трымаліся традыцый,
І не забывалі каранёў.
Каб замест пыхлівасці, амбіцый
Узрастала радасць зноў і зноў.

Продак-волат, дай нам, грэшным, сілы,
Каб маглі пакаяцца заўжды,
Як у храме, ля тваёй магілы
Ў дзень спачылых продкаў — на Дзяды.

Уладзімір ШЫМАНОВІЧ

Туман дзяцінства

Туман, як быццам пернік здобны,
Густы і трошачкі калматы,
На хмарку летнюю падобны —
Вісіць над возерам, за хатай.
Схаваў туман расінак слёзы.
І толькі дзесьці ў траве там,
Пад стромкай велічнай бярозай
Спявае конік. Зранку летам

Туман куляецца, як быццам
Няма яму другога шчасця,
Каб змог хоць хтосьці заблудзіцца
І паблукаць. Не, не прапасці.

Не так, як кажуць: «У трох соснах».
Каб у дзяцінства зноў вяртацца
На момант па сцяжынах росных.
І шчасцем гэтым — наталяцца.

Згадаць і верасень у школе.
Згадаць і «мама мыла раму».
Абгойсаць свет па наваколлі,
Па свежы хлеб схадзіць у краму.

Зайсці ў туман, у мора быццам.
І плысці, аж да болю ў жылах.
Дзяцінства піць, каб наталіцца
І каб на ўсе жыццё хапіла!

Аліна ШАКАЛЬ

* * *

Бацькоўскі дом — жыцця пачатак.
Тут цёплы водар ад зямлі,
Заўжды чакаюць мама з татам
З любых краёў, дзе б ні былі.

Страчае хата дабрынёю,
Святлом матуліных вачэй.
Кране яна сваёй рукою —
І на душы маёй лягчэй.

Як добра — ёсць жыцця прытулак,
Які сустрэне ўсіх цяплом.
Іду ў знаёмы мне завулак,
Шапчу: «Вітаю, родны дом!»

Алеся БРАГІНЕЦ

Свяці

Я ўсюды адчуваю,
Што паветра твой водар прынесла
І зноў ты побач са мной.
Калі ты ў сэрцы — нястрашна нішто!
Я крылы раскрыю з табой —
І адчую святло праз усё, што было.
Прайду я без сумненняў у сабе кожны крок,
Няхай увесь свет абернецца знарок —
Толькі ты мяне не адпускай!
З табой я прыйшла да жыцця
Імклівага,
Яскравага,
Нібыта наяве сны
Нязбытныя!
Дзеля цяпла сустрэч
Адкіну цемру прэч!
Сваіх памылак не лічу,
У жыцці кожны крок асаблівы знайду,
Каб дайсці ўвышыню.
У сэрцы мора цеплыні
Там твае словы, што шэптам
вымаўлены:
«Не спыняйся ніколі — свяці!»
І ў думках зноў шэптам
з'явіўся голас твой:
«Свяціць вакол — гэта твой лёс!»
Ён кажа зноў, зноў і зноў…

Аксана ХАЦКЕВІЧ

Зямля, спазнаная сэрцам

Прыгажосць прыхаваная,
Прыгажосць невыразная,
І няма на табе
Той гламурнай раскошы.
Але сэрцам спазнаная,
Каранямі звязаная,
Ты зямелька мая —
Мой куточак прыгожы.
Цёплы подых палёў,
Ціхі ветрык з лясоў,
І шаўковыя пасмы
Мурожнай травы.
Тонкі покліч буслоў,
Ціхі шэпт салаўёў,
І лясы, быццам сведкі
Тваёй даўніны.

Ты — сям'я працавітая,
Па-братэрску адкрытая,
І з даверам заўжды
Зазіраеш у вочы.
Маладосць самавітая
І зямля сакавітая,
Клапатлівы і мірны
Блакітны куточак.

Аляксей БАРАНАЎ

* * *

Хаты роднай парог
зноўку прыме мяне,
незнарок душа калыхнецца,
нават смуткам затулены
сэрца куток
ад пяшчоты яскрава ўсміхнецца.

Тут я хмары лічыў
і хадзіў па расе,
уўдымаючы вочы да неба.
Бы ратунку глыток,
тут калісьці ўхапіў
водар свежага жытняга хлеба.

І калі самалёт
цягне ў хмары мяне,
адчуваю: да долу нясецца
адарванае, быццам
чыёйсьці рукой,
улюбёнае, шчырае сэрца.

Ніна ДЗЮБАЙЛА

Гукі роднай зямлі

Гукі роднай зямлі… Мілагучна гучаць!
Як хвалююць яны маё сэрца!
Гукі роднай зямлі… Часам іх не чуваць:
Ім адчынены ў памяці дзверцы.

Гэта спеў раўчука, што вясною заве
Снег пабегчы з курганаў у поле,
І шаптанне пуховак на голай вярбе
Пасля доўгай зімовай няволі.

Раніцой, як звініць галасок жаўрука,
Па-над промнямі першымі сонца
Пазяхае лянівa дзяцінства рака
І павольна бяжыць у бясконцасць.

Ахапляе пяшчота, спакой у душы,
Калі чуюцца дожджыку спевы,
Быццам хтосьці мне грае ў санлівай цішы,
Разліваючы флейты напевы.

І чаруе мяне райскі спеў салаўя,
Як выводзіць ён трэлі пад вечар,
Асаблівая песня, свая, у бусла,
Галаву ён задраўшы, клякеча.

Як лагодна кранае лістоту вятрок,
А яна шамаціць, размаўляе,
І жытнёвы на ніве пяе каласок,
Моц пад сонцам сваю набірае.

Як сумліва курлычуць з нябёс жураўлі,
Адлятаючы з роднага краю,
Ім шапоча услед лістапад залаты,
Нібы ціха вярнуцца гукае.

Як трашчаць маразы доўгай лютай зімой,
Замець круціць клубы на дарозе,
Завіруха звіває сняжынкавы рой,
Сцеле коўдру на хатнім парозе.

Гукі роднай зямлі… Хай заўседы жывуць…
Цешаць сэрца сваёй асалодай,
Песняй звонкай далёка, свабодна плывуць
У гармоніі вечнай з прыродай.

«Будзь шчаслівaю, мая дзівосная муза...»

Абразкі

Міхась ПАЗНЯКОЎ

У маладыя гады

Неяк славуты рускі празаік Уладзімір Крупін, з якім мы пасябравалі з першых сустрэч у Мінску і ў Маскве, расказаў мне з усмешкай наступнае. Першая сур'ёзная публікацыя ў яго з'явілася ў далёкія маладыя гады ў маскоўскім часопісе «Юность». Безумоўна, надрукавацца ў знакамітым часопісе было вялікім творчым шчасцем. Юны аўтар лятаў на крылах уяўнай славы. Яшчэ невядомы і непазнавальны ў твар, едучы ў Волагдзе гарадскім аўтобусам, пісьменнік прыкмеціў, як маладая дзяўчына якраз чытала ў «Юности» яго невялічкую аповесць. З вялікім хваляваннем і не меншай радасцю прысеў побач з чытачкай, час ад часу замілавана пазіраючы на яе занятак. Потым, сабраўшыся з духам, поўны асалоднага задавальнення і нават гарачага прадчування пахвалы, прамовіў дзяўчыне:

— Гэта я напісаў!..

Тая скептычна зірнула на яго і абуральна адрэзала:

— Ідзі лепш дамоў і праспіся!..

Уладзімір моўчкі падняўся і пасунуўся на выхад.

Не памылюся, калі выкажу меркаванне, што падобнае здаралася з многімі маладымі літаратарамі. Прыпамінаю і я некалькі сваіх выпадкаў такога кшталту. Адзін з іх і ўвогуле супадае з расказаным Уладзімірам Крупіным. Толькі мая публікацыя была ў газеце «Чырвоная змена», а дзеянне адбывалася ў гарадскім аўтобусе ў Мінску. Памятаю і як у сталічным кніжным магазіне «Светач», куды я зазірнуў аднойчы, стаў сведкам такой карціны. Дзяўчынка гадоў сямі-васьмі трымала ў руках маю кніжку і настойліва прасіла маці купіць яе. На зялёнай вокладцы была намалявана дзяўчынка з яркім букетам рамонкаў.

— Яна ж на беларускай мове, — адгаворвала маці.

Але дачушка не здавалася.

Я падышоў да іх і падтрымаў дзяўчынку, сказаўшы, што з'яўляюся аўтарам гэтай кніжкі і дам аўтограф.

Бліснуўшы недаверліва на мяне як на дзівака абыякавымі вачыма, жанчына ўзяла з паліцы кнігу і паспяшалася да касы. Нібы прысаромлены, я падаўся ў іншы бок.

Згадваецца і адваротнае. У парку імя Максіма Горкага ў Мінску праводзілася літаратурнае свята з выстаўкай кніг і ўдзелам пісьменнікаў. Прадаўшчыца заклікала наведвальнікаў набываць кнігі прысутных аўтараў і браць у іх аўтограф. Яна гучна пералічвала прозвішчы і падымала з прылаўка кнігі, дэманструючы прысутным. Калі ў яе руках апынулася мая кніжка, да прадаўшчыцы падышла бабуля з унучкай:

— Ой, а ў нас такая кніжка ёсць дома. Мы з унучкай чытаем яе з вялікім задавальненнем. Але куплю яшчэ адну дзеля аўтографа.

Яна набыла кніжку і памкнулася да самага старэйшага пісьменніка. Але той разам з прадаўшчыцай паказалі на мяне.

— Такі малады аўтар? — збянтэжылася-здзівілася бабуля. — А я ж думала, што такую добрую кніжку напісаў дзядуля...

Я з прыемнай усмешкай надпісаў аўтограф і падзякаваў бабулі і яе ўнучцы за высокую ацэнку маёй кнігі.

У музеі Льва Талстога

Калі мяне ў маладыя гады прызначылі дырэктарам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску, я праз некалькі месяцаў працы папрасіўся на вучобу ў Маскву. Бо музея яшчэ не было, я павінен быў ствараць яго з нуля. Ні будынка, ні фінансавання, ні штатнага раскладу, ні экспанатаў — нічога. Таму, прарабіўшы пэўную пачатковую арганізацыйную работу, падабраўшы памяшканне, дабіўшыся фінансавання, сфарміраваўшы групу штатных навуковых супрацоўнікаў і разумеючы, што музейная справа — рэч складаная і адказная, нават для мяне — чалавека з філалагічнай універсітэцкай адукацыяй, — вырашыў вывучыць вопыт стварэння і дзейнасці літаратурных музеяў Масквы. Тым больш што кіраўніцтва Міністэрства культуры паставіла мне задачу стварыць арыгінальны музей, зусім не падобны на існуючыя ўжо ў сталіцы літаратурныя музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Міністэрства культуры і накіравала мяне не месячныя курсы ў Маскоўскі інстытут павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры. Безумоўна, апрача розных цікавых лекцый, заняткаў, мы (група дырэктараў літаратурных музеяў амаль усіх рэспублік СССР) наведвалі і некаторыя літаратурныя музеі. Ды і вольны ад вучобы час я таксама імкнуўся прысвячаць знаёмству з музейнай справай. Нямала ўвагі надаваў вывучэнню вопыту стварэння і работы Літаратурнага музея Льва Талстога. Якраз ён мне больш за іншых прыйшоўся па душы — сваёй асаблівай аўрай, хоць музей празаіка заўсёды адрозніваецца ад музея паэта. Найперш тым, што ў паэтавым музеі павінна ва ўсім адчуваецца паэзія, узнёсласць, штосьці таямніча-загадкавае, велічна-прыгожае. Тым не менш больш за ўсё я ўзяў для сваёй далейшай працы менавіта ў музеі Льва Талстога. Чаму? Паспрабую адказаць і вам, і сабе, праз многія гады раскрыць гэтую загадку.

Магчыма, часткова таму, што веліч духу рускай душы, нязломнасць характару, моц таленту, талстоўская філасофія, яго погляды, самі творы мелі вялікі ўплыў на фарміраванне майго жыццёвага крэда, маіх памкненняў, маёй непахіснай веры ў дабро, глыбіннай любові да роднай зямлі... Часткова таму, што і Максім Багдановіч быў цэльнай, глыбокай натурай: лірык, публіцыст, філосаф, асоба энцыклапедычных ведаў, крытык, празаік, перакладчык... Яго магутным магнітам любові прыцягвала родная Беларусь...

І сам музей, яго экспазіцыі, падача матэрыялаў, узровень мастацкага афармлення мелі сваю прыцягальную непаўторнасць. Ды і Леў Талстой пераважна жыў у Яснай Паляне, у Маскве — наездамі. Наш Максім Багдановіч таксама вельмі мала жыў у Мінску: першыя месяцы зямнога жыцця ды апошнія, перад паездкай у Ялту на лячэнне, дзе і знайшоў свой вечны спачын.

Не меней уразіла мяне, нават азадачыла тое, што асобныя раздзелы рамана «Война и мир» вялікі майстар слова перапісваў, правіў дзясяткі разоў. Гусіным пяром на той час! Неверагодная працавітасць і аўтарская адказнасць за напісанае!.. Хто, скажыце, сёння гэтак апантана і настойліва працуе над сваімі творамі?

А яшчэ ў гэтым маскоўскім музеі я пазнаёміўся з прыгажуняй Ірынай. Яна таксама была ў нашай творчай групе. Мы ў музеі, а пасля і ўсюды, трымаліся побач. Спачатку абменьваліся ўражаннямі ад убачанага ў музеі, а затым усё больш разважалі на самыя розныя тэмы. Прыгожая, стройная, душэўная, камунікатыўная, Ірына нагадвала мне галоўную гераіню з тэлесерыяла «Ад'ютант яго правасхадзіцельства». Такая ж абаяльная, чароўная, шчырая. Мы нярэдка хадзілі ў тэатры, кіно, на мастацкія выстаўкі, гулялі па горадзе, сядзелі ў кафэ. З ёю заўсёды было лёгка, утульна, радасна, святочна. Усё ў ёй было гарманічна, цудоўна, непаўторна. Я закахаўся. Моцна, як ніколі. І не ўяўляў свайго жыцця без яе, настолькі яна ўвайшла ў маю душу, разняволіла, асвятліла яе, заваладала маімі думкамі, марамі, стала для мяне ўсім найпрыгажэйшым, найсвятлейшым, найжаданейшым.

Ёй было добра са мной — я адчуваў гэта, але не больш. Яна абажала мяне, як часам у парыве пачуцця ўдзячнасці і захаплення казала сама...

У яе быў муж, з якім яны па нейкай прычыне часова рассталіся. Ён жыў у іншай краіне. Яна, гэта адчувалася, моцна кахала яго, тым болей — бацьку яе маленькага сына. Я разумеў яе ўсім сваім спалоненым сэрцам.

Кожны дзень я прысвячаў Ірыне новы верш, часам два і нават тры. Яна захаплялася не ўсімі, ёй больш падабаліся тыя, дзе не было асабістага, маёй яўнай закаханасці.

Вучоба закончылася, спыніліся нашы сустрэчы і блуканні па Маскве. Мы развіталіся з Ірынай у музеі Льва Талстога. Нам гэта абаім нялёгка было перажыць. Я губляў каханую, яна — добрага, дарагога сябра. На развітанне я падарыў ёй сваё чарговае паэтычнае прызнанне. Без усялякай надзеі, на добрую памяць, разумеючы немагчымую спраўджанасць агульнага лёсу. Там былі такія радкі:

Слышишь? Время летит и летит,
Вовсе нет остановки ему...
Моё сердце стучит и кричит:
Я тебя не отдам никому!
Как в саду закипела сирень!
Мои чувства сливаются с ней.
И звучит расцветающий день:
Будь моей! Будь моей! Будь моей!

Заканчваўся верш так:

Я к тебе вновь навстречу лечу,
Ничего не боясь, не тая.
И в ответ всё услышать хочу:
— Я — твоя! Я — твоя! Я — твоя!

Вядома, не пачуў... Ірына неўзабаве паехала з сынам да мужа, які званіў, клікаў яе ўсё больш настойліва. Я разумеў, адчуваў, што ніколі ў жыцці больш не сустрэну такую, як яна, — адзіную, непаўторную, родную. Ірына прасіла даравацъ ёй, што вымушана паехаць, што не можа адказаць мне ўзаемнасцю. Казала, што будзе заўсёды ганарыцца мной, нашым знаёмствам. Я шчыра пажадаў ёй шчасця, вялікага, прыгожага, моцнага, якога яна вельмі заслугоўвае. Папрасіў не лічыць сябе вінаватай, бо каханне і сям'я вышэйшыя за ўсе мае пачуцці і мары...

Пазней, бываючы ў Маскве, я кожны раз наведваў музей Льва Талстога, нібы прыходзіў на спатканне з Ірынай. Мне станавілася лепш, цяплей і ўтульней на душы, дзе віравала самота і невымоўнай таемнасцю пульсавала бясконцая пяшчота. Здавалася, я бачыў перад сабой Ірыну — прыгожую, стройную, ласкавую, з чароўнай усмешкай, мроіўся яе непаўторны, мілы голас. І кожны раз шаптаў: будзь шчаслівaю, мая дзівосная муза, мая няспраўджаная мара! Дзякуй, што сустрэлася мне, што ты была побач са мною, што ты ёсць... І кожны раз падавалася, што вялікі, мудры пісьменнік суцяшаў мяне: «Мир движется вперёд благодаря тем, кто страдает»...

Галоўная кніга

Аднаго разу мне — старшыні Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі — давялося прыняць у сваім кабінеце іранскага пісьменніка, які праездам з Лондана быў у Мінску і завітаў у наш СПБ.

За кубкам кавы мы, як маглі, дзяліліся думкамі аб развіцці сучаснай сусветнай літаратуры. Мой суразмоўца крыху валодаў рускай мовай, і з пэўнай цяжкасцю, але наша размова доўжылася больш за гадзіну. Госць, дарэчы, нямала быў начуты пра Беларусь і цікавіўся не толькі літаратурным працэсам, працай нашай творчай арганізацыі, але і эканомікай. Нямала пытанняў у яго было і пра нашы прамысловыя брэнды. Асабліва іранца цікавіў трактар «Беларус» Мінскага трактарнага завода, куды я затым яго і скіраваў, выдаўшы нямала захапляльных слоў пра нашу айчынную машынабудаўнічую тэхніку. Наведвальнік, наколькі я здагадаўся, меў нейкае дачыненне да арганізацый, якія займаліся пастаўкамі і набыццём неабходнай тэхнікі. Ды сустрэча з ім мне запомнілася не толькі гэтым. Расказваючы пра свае літаратурныя густы і клопаты, замежны пісьменнік пацікавіўся ў мяне, ці стварыў я сваю галоўную кнігу? У шафе ў мяне было некалькі дзясяткаў маіх кніг самых розных жанраў, адрасаваных як юным чытачам, так і дарослым. Спачатку я вырашыў паказаць госцю сваю вялікую кнігу паэзіі для дарослых. Ён пагартаў яе, спрабуючы ўчытацца ў анатацыю і прадмову, пацікавіўся, якім попытам карыстаецца ў Беларусі паэзія, заўважыў, што і ў Іране паэзія не прыносіць аўтару вялікіх ганараў. А потым ізноў паўтарыў сваё пытанне наконт маёй галоўнай кнігі. Я вырашыў паказаць яму аб'ёмную кнігу прозы для дарослага чытача. Аднак праз некалькі хвілін іранец зноў паўтарыў сваё пытанне. Крыху збянтэжаны гэтым, я дастаў з шафы аб'ёмную вялікафарматную кнігу паэтычных твораў для дзяцей. Толькі ж і яна не задаволіла майго суразмоўцу. Паказаўшы яму яшчэ некалькі сваіх кніг, у тым ліку і двухтомны «Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы», і не атрымаўшы яго ўхвалы, пацікавіўся сам, што ён лічыць галоўнай кнігай. Адказ быў нечакана просты і ясны: кнігу пра свой род, яго гісторыю і духоўныя набыткі...

Я шмат напісаў розных мастацкіх твораў пра сваякоў: вершаў, апавяданняў, нарысаў, эсэ, нават аповесць, але фундаментальнай кнігі пра свой род пакуль не стварыў. Значыць, мая галоўная кніга яшчэ наперадзе. Я ўдзячна паціснуў руку іранскаму калегу за яго такое адметнае пытанне і вельмі слушнае меркаванне.

Спускаецца вечнасць на дол

І раней было відавочна, а цяпер, на адлегласці часу, тым больш, які вялікі след у літаратуры пакінулі паэты, маленства якіх заспела Вялікая Айчынная. Сярод іх — і Анатоль Грачанікаў. Ён, праўда, быў маладзейшы за тых, хто тады ўпершыню заявіў аб сабе. Згадаю іх па алфавітным парадку: Рыгор Барадулін, Сымон Блатун, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Еўдакія Лось, Юрась Свірка, Янка Сіпакоў — безумоўна, пераклік няпоўны. Перажытае ў маленстве пакінула незагойны след у іх творчасці. Што гэта сапраўды так, засведчыў яго дэбютны зборнік «Магістраль» (1964).

Фота xpress.by.

Анатоль Грачанікаў (у цэнтры) сярод супрацоўнікаў інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту.

Агонь цяпла і веры

У ім малады паэт (нарадзіўся 8 верасня 1938 года), як і іншыя, гаварыў ад імя свайго пакалення. Не толькі таму, што матывы, якія гучалі ў творах, былі блізкія і зразумелыя кожнаму, хто ў гэтакім жа, як і ён, узросце, уласнай скурай адчуў звярынае нутро фашызму. Права гаварыць ад імя аднагодкаў ён меў і па іншай прычыне. Многія з яго сяброў так і засталіся на вайне. Хто быў расстраляны нямецкімі захопнікамі, хто ў мірны ўжо час падарваўся на міне. Паэт спяшаўся па гарачых слядах выказаць тое, аб чым маўчаць нельга. І гэтае набалелае, выпакутаванае ўваходзіла ў яго найлепшыя творы, якія і цяпер, калі пра Вялікую Айчынную вайну напісана так шмат, не страцілі сваіх першапачатковых якасцей. У шэрагу падобных твораў, несумненна, адным з першых трэба назваць верш «Вера»:

Я кволы быў, але не хваравіты,
Я рана ўцямію, што такое смерць.
Ад дэтанацыі і ўспамінаў — дынамітам
Майму маленству праз гады грымець.

Гэтае яго маленства, як і маленства пакалення, паступова набывала зрокава выразны малюнак, у якім кожная дэталь да месца. Яна — не прыдуманая, яна — з той часіны, якая ніколі не забываецца: «У гурбах снегу, // Між скалелых хатак, // Маёй не заўважаючы слязы, // Мяне ад галавы да самых пятак // Абмацвалі зімою маразы». А гэта ўжо больш канкрэтныя рэаліі, прывязаныя да свайго, асабістага, узятага са сховаў памяці. Дзіцячай памяці, што не згасае з гадамі, бо нясе ў сабе так шмат...

Інструментоўка верша вельмі прадуманая. І гэта пры невялікай затрацe выяўленчых сродкаў. Але лёгкасць успрымання сказанага падманлівая. Калі не ўнікнуць у напісанае належным чынам, можна прапусціць істотнае, а менавіта яно і схавана за гэтымі самымі… санкамі. На першы погляд можа падацца, што калі з горкі з'язджаў хлапчук-зух, то і вынік зразумелы. Пасля застаецца назад усцяжаць тое, што ад санак засталося. Аднак сітуацыя іншая і зусім нечаканая. Хлопчык не проста катаўся. Ён унізе збіраў ламачча для астылай печы. У творы, дзякуючы аўтарскаму майстэрству, не толькі ўдала спрацаваў знойдзены мастацкі вобраз. Яшчэ на большы роздум наводзіць заключная страфа:

Гарэў агонь.
Агонь цяпла і веры.
У грубцы і ў вачах братоў маіх.
Мы нанач шчыльна зачынялі дзверы,
Але на ключ не замыкалі іх.

Збалелае, незабыўнае

Пазней паэт скажа пра сябе і тых сяброў, якія так і не сталі дарослымі: «З дзяцінства на вуснах маіх — прысмак тугі і гора, і рукі мае, што закрывалі павекі сяброў блакаднай зімою, зябнуць дагэтуль, дагэтуль мне чуюцца песні першых дзён вызвалення». А пакуль спяшаўся пакінуць гэтую памяць у вершах. Тэма скалечанага маленства набывала ўсё больш выразнае раскрыццё. Лірычны герой Анатоля Грачанікава пазнаецца і ў вершы «***От каб быў я такі, як цень!..». Хлапчук украў крыху ячменю са свірна, які ахоўваў паліцай, і радасны вяртаецца дамоў. Анатоль Грачанікаў надзіва дакладна, псіхалагічна вывераная перадаў настрой хлапчука. Як і ўсе ў яго ўзросце, ён нічога не баіцца, але ідзе вайна, таму і жаданні яго дарослыя. Спачатку хоча накарміць згаладалую сям'ю, а набраўшыся сіл, падацца ў лес...

Гэтая памяць не менш выразна загучала ў вершы «Успамін машыніста». Перажытае згадвае не колішні хлапчук, а чалавек бывалы, таму яго ваенная памяць куды больш сканцэнтраваная. За ёй — трагедыя — усяго народа, усёй краіны. Адсюль і элементы падагульнення, падрахунку:

Але дамоў вярнуцца скорым
Змаглі не ўсе, хто так хацеў.
Перад людскім вялізным горам
Я сам, як вугаль, пачарнеў.

Ды абмяжоўваць сябе толькі тэмай вайны не збіраўся. Вабіла і сучаснасць, што відаць і з назвы першай кнігі. За ёй была і яго прафесійная арыентацыя. Як вядома, скончыў Гомельскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, два гады працаваў на Гомельскім рамонтна-механічным заводзе. Гэтая праблематыка таксама знайшла сваё адлюстраванне ў вершах.

Курганы як тыя грыбы

Аднак, як ні дзіўна, у «Магістралі», па сутнасці, не закраналіся палескія матывы, а яны ў наступных кнігах — «Круглая плошча» (1971), «Грыбная пара» (1973, «Начная змена» (1975), «Дрэва на выспе» (1977), не кажучы ўжо пра «Палессе» (1983). Прычына, відаць, у тым, што Анатоль Грачанікаў спяшаўся занатаваць тое, што не мог не выказаць, а з другога боку — тэма рабочага класа на той час лічылася выйгрышнай, таму і звяртаў на яе ўвагу, лішні раз засведчыўшы, што і творы, калі можна так сказаць, «машынісцкай закваскі», калі напісаны памайстэрску, маюць права на жыццё. Ды і ўвогуле справа не ў тэме, а наколькі гэта па-мастацку дасканала.

А зборнік «Круглая плошча» і адкрываўся вершам «На Палессі…». Хоць тагачасная крытыка не сказаць, каб вельмі ўжо пляскала ў ладкі ад яго. Канешне, незаўважным ён не прайшоў: не той выпадак, каб прамаўчаць. Але і тых высокіх ацэнак, якія заслужыў, не атрымаў. Усё стане зразумелым, калі прыгадаць, якія былі часы. Найперш віталася ўсё, звязанае з сучаснасцю. Толькі пазней Уладзімір Гніламёдаў па-сапраўднаму ацаніў вартасці гэтага твора, заўважыўшы, што ў ім «падаюць свой голас продкі: "Добры дзень вам, нашчадкі! Добры дзень вам, зямляне!" А гэтыя словы ў вершы "ўрачыста плывуць у жураўлінае ранне"».

Твор нібы на адным дыханні прамоўлены, а ва ўздыху гэтым — тая самотнасць, калі думкі і мроюцца, і трывожаць. А яшчэ нечакана адчуваеш сябе з'ядным з усім светам, з вечнасцю, але ў той да час не можам не разумець, што сам ты ва ўсёй гэтай загадкавасці толькі маленькая часцінка, якая хутка і лёгка знікае, а вечнасць — застаецца:

На Палессі — спрадвеку, як быццам званы,
Несціхана сівыя звіняць курганы.

То трывожна набатны, то як ранішні сон,
Над зямлёю плыве іх малінавы звон.

На Палессі маім — курганоў як грыбоў.
Мала ў вёсках унукаў і мала дзядоў.

І над імі з маленства, як быццам званы,
Задуменна сівыя звіняць курганы.

І не адпускае ад сябе гэтая вечнасць. Наколькі моцная з ёю сувязь у такім аспекце — курганы як частка даўніны, засведчыў яшчэ адзін твор Анатоля Грачанікава, напісаны пазней, у 1984 годзе — «***Вечарэла».

І стагі вечнасці — таксама

У адрозненне ад папярэдняга, у ім моцны асабісты пачатак. Сваю знітаванасць з вечнасцю лірычны герой паказвае адразу. Не дзесьці з сярэдзіны, як у вершы «На Палессі…». Вечнасцю як бы дыхае ўсё наваколле і з яго нібы прарастае і вырастае само жыццё:

Вечарэла.
Адзін я ішоў
Задуменна-пустымі палямі.
І абрысы пажоўклых стагоў
Уяўляліся мне курганамі.

Параўнанне стагоў з курганамі — нечаканае. Разам з тым яно асабліва да месца, бо дазваляе ўсёй сваёй істотай сягнуць у даўніну:

А яны, курганы, ля дуброў
Зараслі, аплылі і аселі,
Быццам рэха мінулых вякоў
Не ўтрымаліся ў парэзаным целе.

Малюнкі рэальнасці, існасці і тое падсвядомае, прабачце за таўталогію, адначасова нараджаюцца ў свядомасці, перакрыжоўваюцца, што вядзе да збліжэння часавых паняццяў.

І ў гэтым свая загадкавасць. Таксама ў нечым вечнасць таямніцы быцця. Яна вабіць да сябе. Без яе нельга жыць, калі жыць па-сапраўднаму:

Колькі я ні вяртаўся дамоў,
Колькі ні адлучаўся я з дому, —
Не наведаць не мог курганоў.
А чаму?
Гэта мне невядома.

Таму і невядома, што шмат думак пры гэтым з'яўляецца. Аднак, няцяжка здагадацца, яны зводзяцца да галоўнага: мы і гісторыя — тоесныя. Пакуль не абарвецца гэты ланцуг, мы не страцім сябе.

Уменне тварыць дабро

Застаючыся лірыкам на светаўспрыманні, ён, як ніхто іншы, удала спалучаў зямное і касмічнае, штодзённае і тое, што прысутнічае незалежна ад нашай волі, свядомасці. Гэта відавочна ўжо ў вершы «***Шарпілаўка цячэ ў жыццё, як Сож…» (нарадзіўся ў вёсцы ў Гомельскім раёне, назву якой дала гэтая рака), што ўвайшоў у кнігу «Круглая плошча».

Калі ж зноў звярнуцца да кнігі «Палессе», відавочна, што яна стала этапнай у творчасці Анатоля Грачанікава. Наступныя, што з'явіліся пасля яе («Вернасць», «Я вас люблю», «Жнівень-45», «Выбранае»), успрымаліся ўжо не толькі як чарговыя набыткі ці ў нечым падагульненне дагэтуль здзейсненага ім. У «Палессі» ярка сфарміравалася яго творчая асоба. Для яго яшчэ больш важнымі ў жыцці і паэтычнай дзейнасці сталі высокія маральныя арыенціры і крытэрыі, ён яшчэ пільней углядаўся ў рэчаіснасць. Паставіўшы перад сабой арыенціры, хацеў, каб таго прытрымліваліся і іншыя:

Няпраўда,
Што на свеце дрэнна жыць, —
Прыходзім жа на свет
Не дзеля смутку,
Не вытанцоўваць
Пад чыюсьці дудку.
Прыходзім,
Каб дабро ў жыцці тварыць.

Слушна сцвярджаў ужо згаданы Уладзімір Гніламёдаў: «Кнігі А. Грачанікава, бясспрэчна, сведчаць пра самабытнасць паэта, яго адметную індывідуальнасць і вялікія магчымасці мастацкага асваення свету. У лепшых творах паэта вабіць глыбіня і прыгажосць мастацкага слова, духоўная насычанасць, напружанасць маральнага пошуку».

Калаж Аляксандра Скрэбунова.

Вядомы Анатоль Грачанікаў і як дзіцячы пісьменнік. Дарэчы, у 1984 годзе ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР не толькі за «дарослую» кнігу «Палессе», але і за зборнікі «Валерка і лятаючая талерка» і «Казка пра Івана-ганчара і пачвару-цара». Абсягі ж сваёй творчасці пашырыў у 1976 годзе, калі стаў галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка». Пасля ўзначальваў часопісы «Бярозка» і «Маладосць».

Шмат якія яго вершы песенныя ў сваёй аснове, таму Уладзімір Буднік, Генрых Вагнер, Ігар Лучанок і іншыя кампазітары паклалі іх на музыку. Найбольш вядомыя «Дударыкі», «Белая лілея», «Над Белай Руссю — белы снег…». Па-ранейшаму запатрабавана аматарамі літаратуры і яго паэзія. Сведчанне таму — і перавыданні твораў. Летась у выдавецтве «Беларусь» выйшла кніга для дзяцей «Легенды, паданні, сказы». Нядаўна ў Выдавецкім доме «Звязда» пабачыў зборнік паэтаў Гомельшчыны «Жаўрукі над Палессем». У ім поруч з творамі Сымона Блатуна і Уладзіміра Верамейчыка — і яго вершы. Таксама сёлета зноў «завітаў» у выдавецтва «Мастацкая літаратура». Некалі ў ім у колішняй «Бібліятэцы беларускай паэзіі» быў прадстаўлены томікам «Верасень». Цяпер «Новая бібліятэка беларускай паэзіі» таксама не абышлася без яго. Зборнік «Вернасць» — пацвярджэнне, што найлепшае ў літаратуры не забываецца.

* * *

У вершаванай аўтабіяграфіі ён сведчыў:

Сэрца —
Жыцця майго гадзіннік,
Заведзены ў 1938 годзе…

Спыніўся гэты гадзіннік заўчасна 7 сакавіка 1991 года. Ды ў сапраўдных паэтаў ёсць толькі адзін памятны дзень — дзень нараджэння, а смерць успрымаецца толькі як фізічны стан, бо жыццё доўжыцца вечна і працягваецца ў творах.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Пяру падуладна ўсё

Звычайна, адзначаючы юбілей таго ці іншага пісьменніка, хочацца прасачыць яго творчасць ад першых апублікаваных ім твораў да цяперашніх. З'яўляецца магчымасць зразумець, як адбывалася сталенне таленту. Так спачатку і я хацеў зрабіць, аналізуючы набыткі Васіля Шырко — лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Лепшы твор прозы», Літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», удастоенага Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аднак, разважыўшы, перадумаў. З узростам у некаторых пісьменнікаў, нават і тых, хто па-ранейшаму актыўна працуе, часам адбываецца як бы пэўны збой. Новае, што з'яўляецца з-пад пяра, не сказаць, каб дасягала ранейшага для іх узроўню. А ў Васіля Аляксандравіча нібы вярнулася мастакоўская маладосць.

Фота Кастуся Дробава.

Васіль Шырко.

Мілава — тое ж Чурылава

Па-ранейшаму піша так ярка, захапляльна, што яму могуць пазайздросціць многія творчыя маладзёны. Так, лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі стаў за кнігу прозы «Нязваны госць», напісанай за год да 70-годдзя. Раман жа «Плытагоны» з'явіўся яшчэ пазней. Але якая гэта проза! Часам зніму кнігі са сваёй паліцы, перагарну старонку-другую… Не, не знаёмыя сюжэты хачу ажывіць у памяці. Персанажы, напісаныя таленавітым аўтарам, так запалі ў маю памяць, што ўжо ведаю іх як рэальных людзей. Упэўнены, што так і для ўсіх, хто пазнаёміўся з імі.

Асалоду атрымліваю ад іншага, не менш важнага. Ад той мовы, якой напісаны кнігі. У Васіля Шырко яна такая сакавіта-індывідуальная — у лірычных апісаннях, у характарыстыцы персанажаў, у побыце іх, — што няма сумнення: многія з іх нарадзіліся ў вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна, адкуль родам аўтар твораў. Дарэчы, гэтая вёска дала беларускай літаратуры двух лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі — аднаго з пачынальнікаў дзіцячай літаратуры Алеся Якімовіча і годнага прадаўжальніка яго традыцый Васіля Шырко. Таму многія персанажы таксама лёгка пазнаюцца сваёй гаворкай. Іх ніколі не пераблытаеш. «Блізнюкоў» сярод іх няма і быць не можа. Бо Васіль Аляксандравіч добра ведае іх прататыпаў.

Асабліва гэта адчувальна ў рамане «Прынёманскія плытагоны». Да ажыццяўлення задумы яго пісьменнік падступаўся доўга, гадоў дваццаць. Ішоў не толькі ад згадак блізкіх яму людзей — плытагонам у свой час былі яго дзядзька Павел, родны бацька. Асэнсаваў нямала матэрыялаў, у тым ліку і архіўных. Шлях плытагонаў з Уздзеншчыны ўбіраў у сябе не адну сотню кіламетраў. Па рацэ Уздзянцы яны некалі плылі ў Вусу, потым у Нёман, а па ім дабіраліся да Балтыйскага мора. Яны — жыхары вёскі Мілава, у якой пазнаецца Чурылава. Твор атрымаўся вострасюжэтны, ахоплівае шырокі часавы матэрыял: даваеннае жыццё, вайна з белафінамі, Вялікая Айчынная вайна…

У Гвінеі як… дома

А ў кнізе «Нязнаны госць» — сем аповесцей, таксама вострасюжэтных. Каторую ні возьмеш — тая літаратура, якая псіхалагічна дасканала адлюстроўвае жыццё ў самых складаных яго варунках. Да ўсяго такіх нечаканых, што немагчыма паверыць, калі б гэта не адбывалася ў сапраўднасці, як, напрыклад, у аповесці «*Lepra*». Інакш кажучы — праказа. Інфекцыйная хвароба, распаўсюджаная ў шмат якіх паўднёвых краінах. З ёю і сутыкаюцца беларускія ўрачы муж і жонка Шэметы, працуючы ў Гвінеі.

Да Васіля Шырко ніхто з беларускіх пісьменнікаў у Гвінею не зазіраў. Ды гэта не экзотыка дзеля экзотыкі. У асноўным дзеянне звязана з працай Шэметаў, а значыць, і з тым, як і чым жыве гэтая краіна. Спакою ж у Гвінеі няма. Адбываецца чарговы дзяржаўны пераварот. Апавядаецца настолькі праўдзіва, быццам сам аўтар там пабываў. Трэба не толькі ўмела пісаць, але і ўважліва выслухаць суразмоўніка, якога бярэш для твора прататыпам. Праўдзіва паказаны жыццё і дзейнасць Шэметаў і па вяртанні на радзіму.

З гэтакай неаслабнай цікавасцю чытаецца і аповесць, што дала назву кнігі. У аснову таксама пакладзены выпадак неардынарны. Гэтым разам звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Галоўныя героі твора — рэальныя людзі — маршал Савецкага Саюза Васіль Чуйкоў і Герой Савецкага Саюза палкоўнік Кучук. Імі яны сталі ў пасляваенны ўжо час. Сустрэліся выпадкова, калі маршал прыехаў інспектаваць Беларускую ваенную акругу. А маглі б і не сустрэцца. Тады, пад Сталінградам, лёс Кучука, правільней, яго жыццё, залежаў ад Чуйкова.

Ёсць у кнізе і аповесці «Танга на мыліцах», «Незвычайны дыямант», прысвечаныя сучаснасці. А «Бойся данайцаў» і «Святаяннік» — гэта ўжо ваенна-прыгодніцкі жанр, у якім Васіль Шырко таксама адчуває сябе ўпэўнена. Толькі не забывае: прыгоды прыгодамі, а патрабавальнага чытача на мякіне псеўдалітаратуры не правядзеш, таму і тут для яго галоўнае — пісаць псіхалагічна праўдзіва, з глыбокім заглыбленнем у характары.

Талент — ва ўсім талент

Пазнаёміўшыся з набыткамі Васіля Аляксандравіча апошніх гадоў, час азірнуцца і назад. Пісаць жа пачынаў з вершаў. Палюбіў іх дзякуючы свайму бацьку. Ён быў выдатным цесляром, але вельмі любіў і літаратуру. Захапіўся ёю яшчэ перад вайной. Вольны час бавіў за кнігай. Сёе-тое завучваў і з патэфонных пласцінак, бо радыё яшчэ не было. Прынамсі, неяк трапілася адна з запісам «Энеіды» Івана Катлярэўскага. Хоць тэкст быў у арыгінале, з другога разу ведаў яго назубок. Наколькі гэта быў таленавіты чалавек, сведчыць тое, што мог прачытаць па памяць «Новую зямлю» Якуба Коласа. Усяго завучыў 20 паэм і каля 200 вершаў. Ды яшчэ да шаснаццаці гадоў. Чытаў іх саслужыўцам у акопах Вялікай Айчыннай вайны. Выдатную памяць меў і дзед Васіля Шырко. Лёгка завучыў вядомага «Канька-Гарбунка» Пятра Яршова. І сам у спадчыну неблагую памяць атрымаў. Можа дэкламаваць, не задумваючыся, творы каля ста беларускіх паэтаў.

У 1966 годзе Васіль паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. А праз год дэбютаваў у «Чырвонцы» вершамі «Дзеду, мілы мой, дзеду…» і «Каб раней мог адчуць…». У тым жа 1967 годзе змешчаны яшчэ два віршы — «Самае важнае» і «Песня». У 1968-м — «Пісьмо шукала адрасата…», «Вясну люблю…» і «Вір». Пакарыў і часопіс «Маладосць» (№ 8). Творы ўражвалі паэтычнай свежасцю, шчырасцю. Здавалася б, што яшчэ трэба.

Аднак за два месяцы да абароны дыплома забралі ў войска. У Маскву трапіў, у адзін з будаўнічых батальёнаў пад Хімкамі. Успомніўшы пра тое, чаму вучыўся, два нарысы паслаў у армейскую газету «На стройке». Рэдакцыі яны спадабаліся, іх апублікавалі. Праз некалькі дзён у распалажэнні будаўнічага батальёна з'явілася чорная «Волга». Па Васіля Шырко прыехала. Прапанавалі працаваць у газеце. Як было адмовіцца? Друкаваўся шмат, матэрыялы часта адзначалі на рэдакцыйных планёрках. Прапанавалі заставацца ў войску. Ды «воздух Родины, он особенный».

Звольніўшыся з войска і абараніўшы дыплом, пяць гадоў працаваў у «Сельской газете». Аб'ездзіў ці не ўсе раёны Беларусі, у многіх з іх пабываў двойчы. Адзін недахоп — усё ж знаходзіўся далекавата ад сапраўднай літаратуры. Гэта «кампенсавалася», калі працаваў у літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання. Быў старшым рэдактарам, загадваў аддзелам літаратуры і культуры. Вёў перадачу «Ліра», у якой адбываліся сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі. Пазней загадваў аддзелам нарыса часопіса «Полымя», а потым былі газеты «Дзеці і мы», «Наша доля», часопіс Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларуская думка». З'яўляўся галоўным рэдактарам часопіса «Белая вежа» — органа Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Пабрацім Іона Друцэ

На сёння Васіль Шырко — адзін з найбольш вядомых празаікаў, нарысістаў, публіцыстаў. Надзіва плённа працуе і ў галіне дзіцячай літаратуры. Яго кніга «Дзед Манюкін не салжэ», маючы наклад 52 тысячы асобнікаў, была раскуплена за тры дні. Свайго роду працягам яе стала «Дзед Манюкін і ўнукі», якая вытрымала два выданні. Надта ж прывабны, непаўторны яе галоўны герой. Як любіць казаць крытыка, па-сапраўднаму народны характар. Дзе знойдзеш старога, гісторыі якога і дарослым слухаць, — адно задавальненне. Дзяцей ад казак Васіля Шырко за вушы не адцягнеш. Надта ж цікава ім даведацца, як дзед Манюкін змагаўся з нячыстай сілай. Як ратаваўся ад ваўкоў і мядзведзяў. Дый шмат пра што іншае прачытаць. Але не пра аднаго Манюкіна расказвае пісьменнік. Зразумела, і пра тых, з кім яму даводзіцца сутыкацца. Яны ж часцей таксама з тых, пра каго ў народзе кажуць: не сунь яму палец у рот.

Празаічныя творы Васіля Аляксандравіча — глыбока праўдзівыя, надзённыя па сваім гучанні, а тое, пра што гаворыцца ў іх, псіхалагічна выверана. Найперш гэта кнігі, у якіх ён расказвае пра сваіх землякоў. Дарэчы, адна з іх так і называецца — «Дарагія мае землякі», а яшчэ гэта «Зямлі бацькоўскай прыцягненне», «Сцяжына да людзей»… І, канечне ж, «Вунь чурылавец пайшоў», у якой столькі досціпу, што нельга не параўнаць яе са знакамітымі «Ніжнімі Байдунамі» Янкі Брыля, а калі сягаць далей, то з выдатным раманам малдаўскага пісьменніка Іона Друцэ «Цяжар нашай дабрыні». У Васіля Шырко — гэткі ж паглыблены псіхалагізм, мяккі лірызм, а галоўнае ў тым, што яны прасякнуты нацыянальным каларытам. Чытаеш іх і далучаешся да стыхіі народнага жыцця, дыхаеш яго паветрам.

Што яшчэ было, а што будзе

Паспяхова абжывае ён і прыгодніцкі жанр, аб чым засведчылі аповесці «Брыльянтавая брошка», «Зелле ад скрухі», «Воўчыя грыбы». У апошняй паказаны сапраўдны твар фашысцкіх недабіткаў і іх памагатых, якія ў пасляваенны час змагаліся з савецкай уладай і якіх сёння сёй-той гатовы называць барацьбітамі за незалежнасць Беларусі, а на самай справе гэта адшчапенцы, якія змагаліся са сваім народам.

Напісаў Васіль Аляксандравіч некалькі п'ес. Ён і аўтар інсцэніровак па творах беларускіх пісьменнікаў. Стварыў тры тэленарысы пра жыццё і творчасць народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы, якія, паказаныя па тэлебачанні, выклікалі вялікую зацікаўленасць у гледачоў.

Сапраўдны пісьменнік ніколі не можа без творчай працы. Таму і Васілю Шырко не сядзіцца дома. У асэнсаванні сучаснай Беларусі сёння сярод літаратараў яму няма роўных. Робіць гэта праз лёсы тых, хто сваім прыкладам паказвае, як трэба жыць і працаваць, каб можна было з гонарам сказаць, што ў нашай хаце парадак ёсць. Калі сабраць гэтыя выданні, цэлая бібліятэчка атрымаецца. У ёй больш чым дзясятак кніг. Яна папаўняецца з зайздросным пастаянствам. Апошнія «Стрыгаўскія гарызонт» і «Кудзінаўскія світанні». Яны пра вядомых на ўсю краіну брэсцкіх хлебаробаў.

Не зважаючы на ўзрост, Васіль Аляксандравіч працягвае працаваць творча актыўна. У яго планах, прынамсі, кніга пра тых, каму, кажучы яго словамі, ён «у сваім жыцці паціскаў руку». Героямі яе стануць Рыгор Барадулін, Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Сяргей Грахоўскі, Кандрат Крапіва, Яраслаў Пархута, Алесь Якімовіч і іншыя. Ды і якія б творы ён ні пісаў — мастацкія ці мастацка-дакументальныя, «дарослыя» ці для дзяцей, —сумнення няма: усё гэта будзе дасканала, на высокім узроўні. А яшчэ, як сам любіць казаць, з досціпам, жывінкай.

Важна і тое, што абавязкова бачыць перад сабой воблікі прататыпаў. Уяўляе людзей, якія яму нечым запомніліся. Нават казачныя персанажы часам як бы спісваюцца з тых, хто быў у сапраўднасці. Яскравы прыклад таму — той жа дзед Манюкін. Хоць прататыпы герояў мастацкіх твораў Васіля Шырко — неабавязкова чурылаўцы. Ды, несумненна, у іх абавязкова будзе штосьці ад яго землякоў. Малая радзіма яго — гэта частка і вялікай Радзімы, такой блізкай і дарагой усім, хто не ўяўляе сябе без яе жыцця. Як і без роднай мовы.

* * *

Пагаварыў, паразважаў я з Васілём Аляксандравічам. Кнігі яго ўспомнілі, сумесныя дарогі. Бачу, задумаўся, а пасля на твары з'явілася прыязная ўсмешка. Няйначай хоча яшчэ штосьці сказаць. У сваім прадчуванні не памыліўся.

— Адзін з маіх вершаў…

— Нядаўна напісаны?

— Ды не, «суровые годы к прозе клонят». Даўно, яшчэ тады, калі ўвесь свет суцэльнай паэзіяй падаваўся:

І цяпер са мною ты бясконца —
Слова падуладнае пяру,
Добрае, як ласкавае сонца,
Гнеўнае, як вогненны пярун.

Клён, мой клён, прыціхні, калі ласка,
Не шуміце, мудрыя бары.
Слухаю маленства майго казку.
Гавары, зямляча, гавары.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Кірыл ХАЛЕЦКІ:

«Усё, што тычыцца кіно, цікава гледачу»

Калі да 100-годдзя беларускага кіно застаецца зусім нядоўга, то пра што павінна паклапаціцца студыя, каб свята прайшло на ўздыме? Каб юбілей адзначыць годна, найлепшае, што можа парадаваць і кінамайстроў, і кінагледачоў, — гэта перспектыва, надзея, будучыня. Творчы працяг. А што ў нас?

А ў нас на кінастудыі «Беларусьфільм» ідуць здымкі фільма «Кіношнікі», што ў нейкім сэнсе сімвалічна: гэта стужка пра тое, як здымаюць кіно. Галоўны герой — малады рэжысёр, кар'ера якога толькі пачынаецца. Нафантазіраваць можна было б тут шмат чаго, але нам абяцаюць прыадчыніць заслону таямніц кінавытворчасці, як гэта бывае насамрэч у жыцці. І ў прыватнасці з маладымі рэжысёрамі. Таму што распавесці такую гісторыю вырашыў малады рэжысёр Кірыл Халецкі, для якога фільм «Кіношнікі» павінен стаць дэбютам у поўнаметражным ігравым кіно — усё выпрабаваў на сабе і ўласны досвед скарыстаў як аснову для стварэння сцэнарыя. Насамрэч досвед працы ў якасці рэжысёра ў Кірыла Халецкага ўжо быў — малады чалавек нават браў удзел у кінафестывалях са сваімі работамі. Але адна справа — кароткі метр ды за свае грошы, а зусім іншае — поўнаметражная стужка ды з дзяржаўным фінансаваннем. Нібыта выхад на іншы ўзровень. Ды і ступень адказнасці зусім іншая, хоць і дэбют. Акрамя таго, інтрыга таксама больш напружаная: ад моладзі заўсёды чакаюць здзіўлення, адмысловага погляду на рэчы, нейкага творчага прарыву. Таму нават на кінафестывалях дэбютантаў адзначаюць асобна. Пра чаканні ад будучага фільма для сябе і для іншых, пра ўражанні ад работы на здымачнай пляцоўцы ішла наша размова з маладым рэжысёрам.

— Гэта ваш першы дэбютны поўнаметражны фільм. Як атрымалі права на такую работу?

— Напэўна, тут спрацавала некалькі фактараў. Таму што да гэтага я ўжо зняў два фільмы — самастойна, за ўласныя сродкі. Але ў свеце кіно не прынята такія фільмы ўвогуле браць у разлік. Для рэжысёра ўсё пачынаецца з поўнаметражных карцін. Кароткаметражнае кіно — у большай ступені фестывальная гісторыя, а поўнаметражнае больш скіравана на гледача. Ёсць, праўда, фестывальнае поўнаметражнае кіно. Але я свае першыя фільмы зняў яшчэ да прыходу на «Беларусьфільм», калі вучыўся ў Акадэміі мастацтваў, дзякуючы чаму быў адзначаны прэзідэнцкімі стыпендыямі. Гэта значыць, што ўжо быў навідавоку, на добрым рахунку. Тым больш што ўдзельнічаў у кінафестывалі «Лістапад» у 2021 годзе. Адыграў сваю ролю і той фактар, што адным з прыярытэтаў палітыкі ў галіне культуры ў Беларусі стала ўвага і падтрымка маладых творчых людзей. На кінастудыю і раней размяркоўваліся студэнты Акадэміі мастацтваў, але доўга не затрымліваліся. Не ўсім удаецца тут асвоіцца.

Таму спецыяльна дзеля прыцягнення і замацавання новых кадраў Міністэрствам культуры нашай краіны было створана структурнае падраздзяленне «Беларусьфільма» — студыя маладзёжнага кіно «Смолка», куды я атрымаў размеркаванне як кінарэжысёр пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў.

Што значыць у нашых рэаліях быць кінарэжысёрам? Гэта значыць быць рэжысёрам пераважна дакументальных фільмаў. То-бок, кваліфікацыя нібыта не дазваляе здымаць поўнаметражнае кіно. Таму я працаваў на пасадзе кінарэжысёра і зняў рэкламны промаролік для Мінскага кінавідэапракату. Яны звязаліся з нашай студыяй, замовілі ролік пра кінатэатры Мінскай вобласці. Мы яго зрабілі — ім вельмі спадабалася гэтая работа, і яго паказвалі перад сеансамі ў кінатэатрах. Пасля былы генеральны дырэктар кінастудыі Уладзімір Міхайлавіч Карачэўскі папрасіў мяне зрабіць дакументальны фільм да юбілею Беларускага саюза кінематаграфістаў. Я тады нічога не ведаў аб дзейнасці БСК і практычна адкрываў гэтую тэму для сябе. Мы пазнаёміліся з членамі саюза кінематаграфістаў, сярод якіх былі людзі вельмі паважаныя і ўзроставыя, для некаторых гэтыя здымкі сталі, на жаль, апошнімі. Работа была зроблена ў сціслым тэрміны, скончылі вельмі хутка, але вынік аказаўся вельмі ўдалы. Добрае стаўленне да мяне на студыі працягвала ўмацоўвацца. І вось з'явілася ідэя дэбютнага поўнаметражнага фільма — выдатны шанц рэалізавацца як рэжысёру, хоць я працаваў толькі паўгода. Але яшчэ да прыходу на «Беларусьфільм» мы агаворвалі, што ў мяне будзе такая магчымасць — гэта мяне вельмі падкупіла. Выдатна, калі ў 22 гады можаш зрабіць уласны поўнаметражны фільм! Але гэта практычна нерэальна — калі ўлічваць досвед Расіі, дзе фільмаў здымаюць значна больш, чым у нас. Як правіла, у гэтым узросце там можна хіба што трапіць асістэнтам рэжысёра на пляцоўку. А тых, хто жадае зняць свой поўнаметражны фільм, многа — там даволі высокая канкурэнцыя. А вось у Беларусі гэта якраз можа быць цалкам рэальна, нават пры тым, што гэта дзяржаўная Нацыянальная кінастудыя, у якой пэўныя патрабаванні і да тэм, і да аўтараў. Але ў той жа час у яе ёсць запыт на нешта маладзёжнае, новае, эксперыментальнае.

— Але ж вам трэба было прайсці праз конкурс?

— Гэта быў конкурс сцэнарыяў, арганізаваны Міністэрствам культуры. На тое, каб зняць дэбютны фільм, прэтэндавалі некалькі рэжысёраў, некалькі сцэнарыяў, некалькі студый. Міністэрства культуры дало гэтую магчымасць мне.

Супрацоўнікі студыі перажывалі: што ж асаблівага я тут зраблю? А я перажываў за тое, каб рукамі супрацоўнікаў кінастудыі не зрабіць таго, што ім не спадабаецца, але пры гэтым здолець рэалізавацца самому. Напачатку мне падавалася, што гэта надзвычай складаная задача. Таму мы вельмі доўга спрачаліся, пра што сведчыць канчатковы сцэнарый, — ён перапісваўся 12 разоў! Так здарылася, таму што заўсёды хочацца зрабіць як лепш, асабліва калі здымаеш камедыю — а гумар павінен быць трапны і добры, тым больш, што мы расказваем пра той асяродак, да якога датычныя самі. Але калі жартуем пра тое, што ведаем знутры, то важна, каб і звычайны глядач гэта мог адчуць, каб уцягваўся ў сюжэт. Цягам доўгіх спрэчак мы ў выніку прыйшлі да кампрамісу. Гэта быў няпросты этап, але важны: мяне сталі лепей чуць і разумець, і я пачаў больш аналізаваць і разумець.

Цягам здымачнага працэсу, які ўжо завяршаецца, усе ўбачылі, што маладыя кінематаграфісты здольны добра працаваць: у нас была вялікая выпрацоўка за дзень. На добры лад, дэбютант павінен здымаць ад 1 да 2 хвілін у дзень, каб можна было спакойна падумаць, папрацаваць з акцёрамі... А мы здымалі і па восем-дзесяць хвілін у дзень. Насамрэч гэты працэс вельмі зацягвае. Калі здаралася змена, што мы здымалі чатыры хвіліны — для нас было як адпачынак. Але пры гэтым і атрымлівалася добра, як на мой погляд.

— Фільм «Кіношнікі» прысвечаны асяроддзю, якое вы ведаеце знутры. Як спалучыць яго з гледачом, які не так добра разбіраецца ў кіно?

— Калі мы абмяркоўвалі, пра што зняць першы фільм, я прапаноўваў больш эксперыментальныя ідэі, але да іх на кінастудыі паставіліся з асцярожнасцю. Праца пачыналася складана, трэба было прапанаваць нешта больш простае (і многія з тых спрэчак, што ў нас адбываліся, адлюстраваны ў фільме ў жартаўлівай форме). Таму было прынята рашэнне зрабіць камедыю пра тое, як здымаюць кіно. Сама ідэя фільма «Кіношнікі», якую я прапанаваў проста для разгону, узнікла і развівалася дзякуючы нашаму супрацоўніцтву са сцэнарыстам з Масквы Канстанцінам Бакуніным. Ён ужо працаваў з расійскімі кінематаграфістамі, цяпер паводле яго сцэнарыяў здымаюць серыялы на ТНТ. Мы з ім у кантакце былі ўвесь час работы над фільмам: калі раптам узнікала нейкае пытанне, я мог да яго звярнуцца, мы абмяркоўвалі варыянты, вырашалі, як зрабіць лепш.

Ідэя ў тым, каб паказаць той бок існавання кінаіндустрыі, які для гледача заўсёды застаецца «за кадрам». Але менавіта гэта самае цікавае. Заўсёды пасля прыкметных прэм'ер людзям цікава паглядзець «фільм пра фільм», як ішоў здымачны працэс, як працавалі акцёры. Ды і мне самому гэта цікава. Мне падабаецца, што тут мы злучаем тое, што зразумела гледачу, і тое, што падаецца вясёлым самім кіношнікам — калі яны будуць глядзець фільм, то ўбачаць знаёмыя сітуацыі (я іх не прыдумаў, у мяне такое таксама адбываецца). Нават дробязям я надаю належную ўвагу. Напрыклад, у адной са сцэн наш галоўны герой працуе ў архіве кінаплёнкі. Мастакі зрабілі адпаведную дэкарацыю. Прыходжу, саджуся на месца героя і разумею, што мне нібыта нечага не хапае. Запрашаю спецыялістаў, супрацоўніца архіва аглядае пляцоўку і падказвае: гэта павінна ляжаць тут, а тое — там. Усё істотна, усё мае значэнне, бо мы хочам паказаць, як гэта бывае ў рэальнасці. Усё павінна быць праўдзіва. Сама назва «Кіношнікі» вельмі ёмістая, у ёй закладзена ўсё, што адносіцца да свету кіно. А ўсё, што тычыцца людзей кіно, ужо цікава гледачу. Нядаўна выйшаў фільм «Кліпмэйкер» пра 90-я гады, пра моладзь, якая стаяла каля вытокаў вытворчасці ў нас першых кліпаў. Стужка прайшла з поспехам. А ў «Кіношнікаў» ёсць цікавы падтэкст: так сябе могуць называць толькі дзеячы кіно. Ёсць творчыя людзі, якія наўпрост не звязаны з кіно, — гэта дзеячы мастацтва. Але «кіношнікі» — цалкам канкрэтнае і асаблівае асяроддзе.

— Як падбіралі каманду, якая б ажыццяўляла задачы з поўным разуменнем таго, што вы хочаце? Ці сваё слова сказала студыя?

— Студыя прапаноўвала варыянт. Але я хацеў, каб каманда таксама была маладая, каб быў агульны погляд — сучасны, актуальны. Найважнейшым, мусіць, быў выбар аператара. Бо гледачы бачаць фільм яго вачыма. Нават не тое, як рэжысёр прыдумаў, а тое, як аператар зняў. Я вельмі доўга думаў, з кім мог бы працаваць. Кінастудыя прапаноўвала сваіх аператараў, але мы былі б з розных узроставых катэгорый, больш складана было б разумець адзін аднаго. Наш аператар знайшоўся ў нейкім сэнсе выпадкова. Але гэта тая выпадковасць, якая здарылася як па замове. Сёлета ў лютым у нас на студыі абмяркоўвалася магчымасць кантактаў са славутым Усерасійскім дзяржаўным інстытутам кінематаграфіі, каб яго студэнты маглі праходзіць практыку на «Беларусьфільме». Аказалася, што сын Юрыя Казіяткі, вядомай медыяперсоны з Беларусі, — мой аднагодак, якраз заканчваў Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (УДІК). Прынцып, паводле якога я жыву: «выпадковасці не выпадковыя». Я разумею, што наша сустрэча і супраца проста мусіла адбыцца. Стэлефанаваліся, і я адразу ж адчуў, што буду з ім працаваць. А калі пазнаёміліся, аказалася, што ён нам падыходзіць і пачалавечы, і як аператар, і як прафесіянал — я ацаніў яго падчас працы. З лютага мы з Уладзімірам Казіяткам у кантакце. Улетку ён скончыў УДІК з чырвоным дыпломам, пачалася наша сумесная праца. Ён даволі стрыманы, што мне асабліва падабаецца, — не прымае паспешных рашэнняў. Мы абсалютна спакойна можам нешта абмяркоўваць, найбольш істотна тое, што тычыцца таймінгу. Таму што ў кіно ўсё вельмі дакладна, усё вызначана, перапрацоўкі непажаданыя. І нам было важна ўкладвацца ў адведзены час. Наогул, падчас здымак трэба ўмець чуць адзін аднаго. Яму можа быць патрэбны аператарскі дубль, я магу папрасіць акцёрскі — заўсёды ёсць магчымасць прыйсці да кампрамісу. Таму працаваць было даволі камфортна. Акрамя Уладзіміра ў нашай здымачнай групе ёсць яшчэ спецыялісты, у якіх дэбют у поўнаметражным кіно. У нас шмат моладзі ў камандзе. Напрыклад, гукарэжысёр Настасся Панасевіч, выпускніца Беларускай акадэміі мастацтваў. Музычнае афармленне фільма таксама ажыццяўляюць маладыя хлопцы, што для мяне было прынцыпова: фільм павінен запомніцца яшчэ і музыкай.

Ёсць у нас і дасведчаныя кінематаграфісты, людзі з багатым прафесійным багажом, што вельмі каштоўна. Мне падабаецца, як працуе наш мастак-пастаноўшчык Ігар Хруцкі, у якога за плячыма ўдзел у здымках многіх карцін. Вельмі ініцыятыўны чалавек, яго прапановы шмат у чым мы падтрымалі. Падабаецца, што прадстаўнікі розных пакаленняў працавалі зладжана. Атрымалася, што больш дасведчаныя асобы ў нас адказвалі за адміністрацыйныя пытанні (куды ж без іх?) і больш глабальныя, што вызначалі візуальны вобраз фільма. А ўсё, што тычыцца творчасці і палёту думкі і фантазіі, — гэта зона адказнасці моладзі.

Моладзь і досвед, на мой погляд, могуць суіснаваць арганічна, калі ўсе зацікаўлены ў добрым выніку і працуюць на яго. А ці можа быць вынік іншы, калі справа тычыцца агульнай для нас тэмы і справы — кіно?.. Гэта надае і натхнёнасць, і асаблівы дух карціне, якую мы ствараем хоць і пра сваё, але для ўсіх, хто любіць кіно.

Ларыса ЦІМОШЫК
Фота даслана аўтарам

«Я жыў на Ракаўскай вуліцы…»

З Леанідам Аронавічам Шварцманам (1920—2022) мяне звязвае тоненькая стужачка ўспамінаў. Працуючы ў газеце «СБ. Беларусь сегодня», часам пісаў для беларуска-расійскай газеты «Союз: Беларусь — Россия», якая раз на тыдзень выходзіла ўкладкай і ў беларускай штодзённай газеце «СБ. Беларусь сегодня», і ў маскоўскай «Российской газете». І, канешне ж, тэмы стараўся шукаць тыя, якія маглі б зацікавіць чытача самага патрабавальнага… Так падрыхтаваў цыкл гутарак з добра вядомымі на агульнай постсавецкай прасторы дзеячамі культуры і мастацтва — пісьменнікамі Чынгізам Айтматавым, Давідам Кугульцінавым, Віктарам Бокавым, Ірынай Такмаковай, Барысам Дубровіным, Юрыем Рытхэу, акцёрамі Леанідам Невядомскім, Ірынай Мазуркевіч, скульптарам Эрнстам Неізвестным…

Леанід Шварцман.

Са сваімі суразмоўцамі гутарыў па тэлефоне. Здаралася, што даводзілася званіць па некалькі разоў. А з кімсьці проста перамаўляўся два-тры разы, а інтэрв'ю чамусьці не атрымлівалася. Мо настрой не адпавядаў, мо іншыя прычыны знаходзіліся, да некага, пэўна, не ў пару патэлефанаваў… Але і гэтыя размовы затрымаліся ў памяці — як, дарэчы, з Анатолем Алексіным, Мустаем Карымам… За некаторымі гутаркамі — даўняе сяброўства, сустрэчы ў розных гарадах і краінах. Як — з туркменскім кінарэжысёрам Хаджакулі Нарлієвым. Мы з ім былі знаёмы па ашхабадскіх, туркменскіх гадах сярэдзіны 1980-х… А з паэтам і празаікам Барысам Дубровіным ці не паўтара дзесяцігоддзя перад інтэрв'ю ліставаліся…

Леанід Шварцман, якому пазваніў, даведаўшыся, што ён нарадзіўся ў Мінску, на гутарку пагадзіўся адразу. У выніку з'явілася інтэрв'ю, якое было надрукавана ў газеце «Союз» 20 лістапада 2003 года, — «Крестный отец" Чебурашки». Так, найбольшая вядомасць Шварцмана — гэта яго ўдзел як мастака-пастаноўшчыка ў

«Залатая антылопа», 1954 г.

стварэнні візуальнага вобраза Чабурашкі для мультфільма Рамана Качанава «Кракадзіл Гена» ў 1969 годзе. А ў гутарцы для «Союза» народны мастак Расійскай Федэрацыі (званне Леанід Аронавіч атрымаў у 2002 годзе) заўважыў наступнае: «…Усе ведаюць выдатныя кнігі Эдуарда Успенскага. Але кнігі маглі б так кнігамі і застацца, пахаваўшы Чабурашку, які так яшчэ і не нарадзіўся… Справа ў тым, што пісьменнік, шмат чаго расказаўшы маленькім чытачам, не апісаў знешнасць Чабурашкі. І калі Раман Качанаў, рэжысёр фільма, запрасіў мяне папрацаваць мастаком-пастаноўшчыкам, я ўзяўся прыдумваць свайго Чабурашку. Няма ж у прыродзе такой істоты. Ды і кніга не падказвала яго партрэт. Спярша, задумаўшы стварыць крыху мяккага, пухнатага звярка, намаляваў свайго "вушасціка" з нагамі, хвастом. Малюнкі паказаў Раману Качанаву, іншым удзельнікам творчай групы. Стварыўся ўжо нейкі вобраз. Але разам з тым і шліфоўка працягвалася. Дзеля таго, каб палегчыць "падарожжа" Чабурашкі па мультыплікацыйнай "шматстаронкавасці", адмовіліся ад ножак, засталіся толькі ступні. Знік і хвост. Так нарадзіўся чалавечы звярок, гэтакае добрае мультыдзіва…»

Інтэрв'ю надрукавалі, а вось для мяне засталіся яшчэ пытанні… Спытаўшы дазволу, ці магу я напісаць яшчэ і ліст, калі ўзнікнуць якія пытанні, атрымаў ад Леаніда Аронавіча станоўчы адказ, атрымаў і адрас: Масква, Сірэневы бульвар, дом 47, кватэра 77… Завязалася перапіска. Мастак даслаў мне паштоўкі з яго малюнкамі да розных мультфільмаў. Даслаў і арыгінальную, ім намаляваную паштоўку як віншаванне з Новым, 2004-м годам. Малпа (успомніце: Шварцман — і мастак-пастаноўшчык, і рэжысёр цэлага цыкла мультфільмаў пра гэтых жывёл, якія выйшлі на экраны ў 1983—1997 гады!), трымае келіх з чырвоным напоем — шампанскім ці віном. Унізе як аўтограф: літары «Л. Ш.».

З ліста ад 8 студзеня 2004 года: *«Паважаны Алесь! Віншую Вас з Новым годам. Вельмі рады, што Вы атрымалі мой заказны ліст з малюнкамі і фотаздымкамі.*

Раскажу крыху пра сябе і галоўные мае фільмы. Сумесна з А. Вінакуравым, таксама мастаком-пастаноўшчыкам, і рэжысёрам Л. Атаманавым мы стварылі "Пунсовенькую кветачку" ў 1952 г., "Залатую антылопу" — 1954 г. і "Снежную каралеву" — 1956 г. Затым я шмат гадоў працаваў з рэжысёрам Р. Качанавым. "Згубілася ўнучка" — 1966 г., "Рукавічка" — 1967 г., "Кракадзіл Гена" — 1969 г., "Чабурашка" — 1971 г., "Шапакляк" — 1973 г., "Аўрора" — 1974 г. З рэжысёрам І. Уфімцавым мы зрабілі серыял "38 папугаяў" (8 фільмаў) — 1976—1979 гг.

У 1976 г. я ізноў пачаў працаваць як мастак з рэжысёрам Л. Атаманавым над серыялам "Кацяня па імені Гаў" (4 фільмы) — 1976—1981 гг. Калі Леў Канстанцінавіч памёр у 1981 годзе, я завяршыў пяты фільм як рэжысёр і мастак.

«Чабурашка», 1971 г.

«Кацяня па імені Гаў», 1976—1981 гг.

Затым я зрабіў фільм "Гірлянда з немаўлят" — 1993 г. Да 1997 года я ўжо ствараў фільмы як рэжысёр і мастак. <…>

З 1954 года я член Саюза мастакоў СССР.

З 1957-га — член Саюза кінематаграфістаў СССР.

У 2002 годзе мне прысвоена званне "Народны мастак Расіі".

Вось што мне хацелася вам паведаміць.

З найлепшымі пажаданнямі — Л. Шварцман.

Прабачце за дрэнны почырк.

8.01.2004».

Былі і іншыя лісты. Нешта, на вялікі жаль, згубілася. Ды і я саромеўся дакучаць мастаку, бо навідавоку было захворванне пальцаў, якімі ён, пэўна, з вялікай цяжкасцю выводзіў літары… Невыпадкова ж і прабачэння папрасіў «за дрэнны почырк».

У адным з пісьмаў Леанід Аронавіч расказаў пра другога мінчаніна — Льва Мільчына… Я ўжо ведаў, што ёсць такі таленавіты мастак-пастаноўшчык і рэжысёр у савецкай мультыплікацыі, які таксама нарадзіўся ў Мінску… Але шмат цікавей было прачытаць пра яго ў лісце нашага земляка… «Паважаны Алесь, — напісаў Леанід Аронавіч, — з задавальненнем раскажу Вам пра майго сябра дзяцінства Льва Мільчына.

Мы з ім нарадзіліся ў Мінску. Ён — 18 жніўня 1920 г. А я 30 жніўня 1920 г., абодва пайшлі ў "нулёўку" ў 1927 годзе ў школу № 5. Абодва малявалі з дзяцінства. Але так, як маляваў Лёва, у нас ніхто не маляваў. Ён маляваў на ўсіх уроках і маляваў заўсёды. Яго малюнкі — гэта шматфігурныя кампазіцыі; рыцарскія двубоі, марскія баі; грандыёзныя будоўлі дамоў і заводаў. Нас, яго аднакласнікаў, здзіўляла яго фантазія і яго хуткасць малявання. Мы абодва вучыліся ў мастацкай студыі ў выкладчыка Валянціна Віктаравіча Волкава. Закончыўшы дзесяцігодку ў школе № 42 у 1938 годзе, мы паехалі ў Ленінград паступаць у Акадэмію мастацтваў. Абодва не паступілі. Але я пайшоў вучыцца ў школу пры Акадэміі, а Леў Ісаакавіч паехаў у Маскву і паступіў на мастацкі факультэт "ВГИКа".

У 1943 годзе ён бліскуча абараніў дыплом на тэму "Ціль Уленшпігель". У 1944 годзе працаваў мастаком-пастаноўшчыкам на фільме "Нашэсце" з рэжысёрам Абрамам Роамам. У 1945 г. мастак-пастаноўшчык мультфільма "Канёк-Гарбунок" з рэжысёрам Івановым-Вано. Стварыў шмат мультфільмаў як мастак і рэжысёр. Паралельна выкладаў у "ВГИКе". У 1945 г. я паступіў у "ВГИКе», і ён выкладаў у нас карыкатуру і шарж. Бацька яго быў мастаком. Бацька, маці і сястрычка загінулі ў мінскім гета. Жылі яны на былой Шырокай вуліцы на беразе Свіслачы, насупраць тэатра Оперы і балета. Памёр Леў Ісаакавіч у 1987 годзе.

«Пунсовенькая кветачка», 1952 г.

<…>

Я жыў на Ракаўскай вуліцы, у раёне Нямігі. Бацька мой з Вільнюса, а мама — мінчанка. Бацька працаваў на цагляным заводзе. Старэйшыя брат і сястра ўжо памерлі. Вось, здаецца, і ўсё…»

Леанід Аронавіч Шварцман памёр 2 ліпеня 2022 года ў адной з маскоўскіх бальніц. На 102-м годзе жыцця. Адпяванне прайшло ў царкве Мікалая Цудатворцы ў Новай Слабадзе. Развітваліся з мастаком мультыплікацыйнага кіно ў Маскоўскім Доме кіно. Пахаваны наш зямляк у вёсцы Зарэчча ў Кіржацкім раёне Уладзімірскай вобласці.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Чынгіз Айтматаў — для ўсіх народаў і часін

У красавіку 2023 года ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Казахстан ў Алматы ў межах Сусветнага дня кнігі і аўтарскага права адбыўся Міжнародны круглы стол «Чытаем Чынгіза Айтматава». Яго работу адкрыла дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Бахытжамал Аспанава. Арганізатарамі выступілі Кыргызскае этнакультурнае аб'яднанне *MURAS*, Інстытут літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава (Казахстан).

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнуліся дзяржаўны і грамадскі дзеяч, паэт, драматург, заслужаны дзеяч Казахстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Казахстан у галіне літаратуры і мастацтва Нурлан Аразалін; дзяржаўны дзеяч і дыпламат, паэт, празаік Мухтар Шаханаў, які на працягу шэрагу гадоў кіраваў дыпламатычнай місіяй Казахстана ў Кыргызстане; генеральны дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава Камітэта па навуцы Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Рэспублікі Казахстан, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Казахстан Кенжэхан Матыжанаў; дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік Акадэміі педагагічных навук Рэспублікі Казахстан, доктар філалагічных навук, прафесар Бейбут Мамраеў; старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», лаўрэат Прэміі СНД «Зоркі Садружнасці» Алесь Карлюкевіч. Вось што, у прыватнасці, сказана было ў мінскім вітанні Міжнароднаму кругламу сталу:

«Удзельнікам Міжнароднага круглага стала "Чытаем Чынгіза Айтматава".

Дарагія сябры! Прастора сапраўднай прозы, сапраўднай паэзіі бязмежная. Рушацца імперыі і дзяржавы, праходзяць стагоддзі, перапісваецца гісторыя, але сапраўднае мастацкае слова, якое ўвабрала ў сябе карціны жыцця, увасобіла філасофію пісьменніка, асвечанае яркай паходняй праўды, глыбіні думкі, застаецца з новымі пакаленнямі.

Чытаючы раманы і аповесці вялікага Чынгіза Айтматава, ні кропелькі не думаеш пра прыгажосць стылю і сакрэты кампазіцыі твора. Ты проста жывеш адным жыццём і з аўтарам, і з яго героямі.

Можна валодаць іншым, адрозным ад пісьменніцкага, поглядам на жыццё. Але нельга не быць салідарным з ім у разуменні верхавенства маральнага выбару.

Чынгіза Айтматава, даўно адкрытага ў Беларусі, у тым ліку і дзякуючы выключна чуйна, тонка перакладзенаму Міхасём Стральцовым на беларускую мову раману «Буранны паўстанак», і на новым этапе гістарычнага развіцця добра чуюць беларусы.

Плённай працы кругламу сталу "Чытаем Чынгіза Айтматава", яшчэ болей ценснага ўсім суперажывання з думкамі і ідэямі класіка кыргызскай і сусветнай літаратуры!

Добрага ўсім часу! Светлыні і дабрыні вакол кожнага з вас, дарагія сябры! А тое, што талент Чынгіза Айтматава стварыў неўміручыя творы, якія застануцца праз стагоддзі, сумняваецца не даводзіцца!»

Віцэ-консул Генеральнага Консульства Кыргызскай Рэспублікі ў г. Алматы Гульзат Абдурасава і намеснік старшыні Кыргызскага этнакультурнага аб'яднання *MURAS* Манас Ташыбекаў падзякавалі аргнізатарам цікавага мерапрыемства і пажадалі змястоўнай працы. Цэнтральнай падзеяй стала прэзентацыя кнігі Асана Ахматава і члена Нацыянальнага Саюза пісьменнікаў Кыргызскай Рэспублікі Розы Айтматавай «Ата-Бейіт». Быў прадэманстраваны дакументальны фільм «Белыя сны па дарозе дадому». З дакладамі выступілі паэт, празаік, перакладчык, кнігавыдавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва імя Абая Бахытжан Канап'янаў; навуковы супрацоўнік Цэнтра ўсходнееўрапейскіх даследаванняў, *PhD* Ніна Фрыс (Берлін), паэт Райымжан Курбанаў (Бішкек, Кыргызстан); загадчык аддзела міжнародных сувязей і сусветнай літаратуры Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава Святлана Ананьева (яна з'яўлялася і мадэратарам круглага стала); галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава, доктар філалагічных навук Алімжан Хамраеў; старшыня асецінскага этнакультурнага цэнтра «Ірныхас» Казбек Мамсураў; начальнік упраўлення палітычнага супрацоўніцтва Прадстаўніцтва МЗС Рэспублікі Казахстан у горадзе Алматы, выпускніца майстэрні Чынгіза Айтматава Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага Алмаша Арэнава; галоўны эксперт Рэспубліканскага Дома дружбы, доктар філасофскіх навук Гульміра Білялава і інш. У рабоце круглага стала прынялі ўдзел кіраўнік па рабоце з этнакультурнымі аб'яднаннямі КДУ «Кагамдык келісім» Упраўлення грамадскага развіцця горада Алматы Нурлан Мауленаў; старшыня Савета Асацыяцыі «Міцва», член Савета АНК Аляксандр Барон; старшыня грамадскага аб'яднання «Казахстанскі рускі культурны цэнтр», намеснік старшыні Асамблеі народа Казахстана горада Алматы Усевалад Лукашаў.

Чынгіз Айтматаў (у цэнтры) гутарыць з народным паэтам БССР Петрусём Броўкам.

Адбылася прэзентацыя рамана Чынгіза Айтматва «Буранны паўстанак: І вякуе дзень даўжэй за век», выдадзенага на беларускай мове ў Мінску, і калектыўнай манаграфіі Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава КН МНВА Рэспубікі Казахстан «Казахстан і сусветная літаратурная прастора: кампаратыўныя даследаванні», у якой прадстаўлены раздзел С. Ананьевай «Казахстан — Кыргызстан: постсацыялістычная оптыка нацыянальных літаратур». Выдадзеная ў 2018 годзе на беларускай мове кніга Чынгіза Айтматава «Буранны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век» у свой час была прэзентавана ў Мінску ў Доме дружбы. Выступаючы тады на прэзентацыі, Алесь Карлюкевіч адзначыў, што «культура і кніга заўжды з'яўляюцца мостам, які яднае краіны і народы. Відаць, болей чым 30 гадоў назад, калі беларускі майстар мастацкага слова Міхась Стральцоў працаваў над перакладам гэтага рамана на беларускую мову, людзі і не думалі пра тое, што выданне кнігі будзе паўтарацца. Відаць, і жывучасць самога рамана, і жывучасць перакладу ажыццёўленага беларускім паэтам і празаікам, — усё гэта разам і садзейнічае таму, што твор Чынгіза Айтматава ізноў прыйшоў сёння да чытача на беларускай мове». І яшчэ падкрэсліў беларускі літаратар: «…Чынгіз Айтматаў — з тых пісьменнікаў, якія даўно і адразу, з першых яго аповесцей, кніг заўважылі беларускія перакладчыкі. Першыя пераклады на беларускую мову з'явіліся ў 60-я — пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Гэта сведчыць пра блізкасць нашых культур, пра блізкасць нашых нацыянальных літаратур… Хацелася б, каб сонца Чынгіза Айтматава, якое распаўсюдзілася на 150 моў народаў свету, сонца яго прозы, сонца яго перакананняў, сонца яго гістарычнай памяці і шанавання традыцый папярэдніх пакаленняў распаўюджвалася на наша штодзённае жыццё, каб гэта адлюстроўвалася ў выхаванні дзяцей, шанаванні традыцый розных народаў».

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызстана ў Беларусі Кубанычбек Амураліеў, які ў той час працаваў у Мінску, адзначыў, што выданне рамана асабліва прыемна бачыць у гэты час, бо яно прымеркавана да 90-годдзя з дня нараджэння Чынгіза Айтматава і да 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных зносін паміж Беларуссю і Кыргызстанам. Дыпламат працытаваў выказванні вядомага мысляра і пісьменніка, адзначыўшы іх актуальнасць на многія часіны. «Чынгіз Айтматаў выкладаў свае меркаванні і пра сённяшні дзень, і пра будучыню. Ён прыўнёс у літаратуру істотна новае мышленне, абгрунтаваўшы найвышэйшыя духоўныя каштоўнасці як аснову сутнасці чалавека. Сведчаннем яго майстэрства стаў твор "Буранны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век"», — сказаў Кубанычбек Амураліеў.

Кніга Чынгіза Айтматава на беларускай мове была таксама прэзентавана на 47-м Лонданскім кніжным кірмашы. Адзін экзэмпляр перададзены ў Беларускую бібліятэку імя Францыска Скарыны ў Лондане, яшчэ адзін — у Акадэмію імя Чынгіза Айтматава ў Лондане. Выданне выйшла ў 2018 годзе па ініцыятыве Пасольства Кыргызскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь і па замове Міністэрства інфармацыі Беларусі ў выдавецтве «Народная асвета». Шмат сіл і стараннуў у справе рэалізацыі гэтага творчага праекта прыклала дырэктар выдавецтва Вікторыя Калістратава. Аўтар ілюстрацый да рамана — вялікі беларускі кніжны графік Арлен Кашкурэвіч. А на круглым стале ў Алматы экзэмпляр беларускага выдання рамана «Буранны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век» быў падараваны сястры пісьменніка — Розе Айтматавай.

У 2018 годзе Саюз пісьменнікаў Беларусі правёў і Міжнародны літаратурны конкурс на найлепшы твор, прысвечаны Чынгізу Айтматаву, — «З марай пра белы параход». Пераможцаў і лаўрэатаў узнагародзілі ў мінскай кніжнай краме «Дружба». Імі сталі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь паэт і перакладчык Мікола Мятліцкі, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення паэтэса, празаік, дзіцячы пісьменнік, драматург Тамара Краснова-Гусачэнка. У конкурсе прынялі ўдзел паэтэса і перакладчыца з



Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1987 год. Пераклад Міхася Стральцова.

Сербіі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Даяна Лазаравіч, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі Генадзь Іваноў.

…Яшчэ ў 2003 годзе Чынгіз Айтматаў даў інтэрв'ю для беларуска-расійскай газеты «Союз», якая і цяпер выходзіць як дадатак да газеты «СБ. Беларусь сегодня» і «Российской газеты». Вось што, у прыватнасці, сказаў вялікі пісьменнік, адказваючы на адно з пытанняў: «…Беларусь, пахаваўшы Васіля Быкава, відаць, наблізілася да ўсведамлення таго, што значыць пісьменнік у грамадстве. Але ці здольны пісьменнік, ці здольна літаратура палепшыць свет?

У літаратуры, творчасці, калі можна ў дадзеным выпадку прымяніць гэты тэрмін, мы з Васілём Быкавым былі аднакашнікамі. Адно пакаленне, адно разуменне многіх рэчаў. Канешне ж, Васіль Быкаў — фігура знакавая, гэта эпоха ў савецкай літаратуры, якая прарывалася, ачышчала сябе і атачэнне. Нягледзячы на мноства перашкод у тагачаснай ідэалогіі. І гэта нас зблізіла. Здаецца, зусім нядаўна мы былі ў Германіі на адной канферэнцыі. Жылі пару тыдняў у адным доме. І стасункі з Васілём Уладзіміравічам натхнілі мяне.

Але болей усяго трымаю ў памяці адзін даўні маскоўскі сімпозіум. Абмяркоўвалі сусветныя тэмы. Тады ў модзе была барацьба за мір. І вось я, магчыма, універсальна па тых часінах падышоў да тэмы, назваўшы людзей усёй планеты зямлянамі. Хацелася акрэсліць адзінства, нашу сусветную супольнасць. Жывём жа мы разам. І тады адзін з цэкоўскіх тыпаў — дакладна не памятаю яго позвішча — выйшаў на трыбуну і кінуў мне папрок: "Адкуль вы ўзялі гэты буржуазны тэрмін? Што, класавы вораг — таксама наш зямлянін?.." Там прысутнічаў і Васіль Быкаў. Менавіта Васіль Уладзіміравіч выступіў следам за цэкоўцам. І патлумачыў, што калі мы будзем вечна дзяліць усіх па класавым прызнаку, то наўрад ці да чаго добрага гэта прывядзе. Сказаў гэта пераканаўча, выразна. Мужнасць пісьменніка — адзіная катэгорыя, якая здольна ўплываць на развіццё навакольнага жыцця ў лепшы бок. Мужнасць у адкрытым дыялогу і мужнасць перад чыстым аркушам паперы…» Такім мужным чалавекам быў і сам годны сын кыргызскага народа…

Чынгіз Айтматаў, павага да класіка кыргызскай нацыянальнай і сусветнай літаратуры сабрала ў Алматы на Міжнародным круглым стале зацікаўленых даследчыкаў яго творчасці, людзей, нераўнадушных да ісцін, якія прасоўваў у сусветнай прасторы легендарны празаік, дыпламат, грамадскі і палітычны дзеяч… Тых, каго хвалююць і сёння героі, вобразы, мастацкія і філасофскія сімвалы, творы Чынгіза Айтматава.

Магчыма, круглы стол, чарговы зварот да творчай спадчыны вялікага пісьменніка паўплываюць на новыя віткі ў фарміраванні сусветнай прасторы памяці пра аўтара «Джамілі» і іншых яркіх твораў, якія паўплывалі на чытацкае мышленне, на сам літаратурны працэс. Сёння ёсць вуліцы, якія названы ў гонар Чынгіза Айтматава, у Бішкеку, Казані, Анкары, Баку, Астане, Люксембургу, Ташкенце. Будзем верыць, што вуліцы з імем пісьменніка з'явяцца і ў Мінску, Душанбэ, Ашхабадзе, Маскве, Санкт-Пецярбургу, Тэгеране, Дэлі, Пекіне і іншых гарадах свету.

Максім ПЯСЧАНСКІ

Сон-Куль

Урывак з рамана «Сіта жыцця»

Насірдзін БАЙТЭМІРАЎ

Яшчэ ўчора возера было іншым. Возера злілося з небам, неба — са скалой. Зоркі, нібы раса, падалі на горы. Так, зоркі плавалі ў возеры, гарэзавалі, быццам маленькія дзеткі. Як шкада, што ў возеры няма рыбак, а то яны гулялі б у зоркі! Выдры, плаваючы ў возеры, расколвалі зоркі сваімі мыскамі, выбіралі, якія падабаюцца, перакочвалі лапкамі, узвальвалі сабе на спіны, ператвараліся на нейкае імгненне ў зоркі, у сапраўдныя. Яны елі гэтыя зоркі, пілі зоркі, перакочвалі іх замест мяча. Ах, якім прыгожым было неба ў гэтыя хвіліны — усё чыста ўсеяна зоркамі! Яны не змяшчаліся на небе і падалі на горы, на раўніны, нібы саспелы вінаград. Зоркі пакрылі рогі горных козачак. Месяц асвяціў скалы. Усё ззяе — увесь свет, здавалася, смяецца.

А сёння — сёння ўсё ў свеце нахмурылася.

Яшчэ ўчора ў гэты час, хоць ужо сцямнела, белыя юрты ўпрыгожвалі берагі Сон-Куля і падножжы вялікіх гор, якія акружылі возера. Спевы дзяўчат і хлопцаў дзіўна спалучаліся з гэтай ноччу. Табуншчыкі спявалі сваю песню — «Шарылдан», а дзяўчаты і маладыя жанчыны — сваю, «Бекбеке», тую, што заводзяць звычайна, вартуючы летняй ноччу авечак. Спявалі ў некалькі галасоў, галасы далятаді з аднаго аіла ў іншы, збліжаліся, зліваліся:

Бекбеке пераваліў праз перавал,
пераваліў, ой,
На яго стане ладна сядзіць пояс, ой!
Уважліва пільнуй,
ідуць шматлікія статкі.
На яго бядры ладна прымасціўся лук, гэй!

Вось гэта і ёсць «Бекбеке». Песня заканчвалася вокрыкамі: «У-уйт! Гайда-ак! Сыду-уйт!» Але хіба яны толькі ахоўвалі статак ад ваўка? Не. У песні жылі і маладосць, і какецтва, і знак, які падаюць каханаму. Іх чыстыя, выразныя, пяшчотныя галасы салодка закалыхвалі ў юртах не толькі дзяцей, але і дарослых. А іх смех! У ясную месячную ноч ясныя і галасы, і жаданні, і смех.

Хто толькі не пабываў на берагах Святога возера! І багацей, які адгадаваў пуза, і вечна пахмурны суддзя-бій, і валасны, які не наесца, нават калі праглыне акругу, і бай, які прывык, нібы косткай-альчыкам, гуляць жыццямі сваіх няволькіаў, і злодзей, падобны воўку, і двудушны святоша, які насміхаецца цішком не толькі з дарослых, але і з дзяцей. Не кажучы ўжо пра нявольніка, які сам сабе не гаспадар, і пра ўдаву, якая днём хавае твар ад сонца, а ўвечары валіцца ад стомленасці, хаваючы свой смутак; не кажучы ўжо пра гэтых гаротных, тут пабывалі спевакі, самыя мілагучныя і красамоўныя ў свеце, і прыгажуні, падобныя да казачнай Акмаор, на лбе якой гулялі промні сонца, і барцы, якія спаборнічалі на вяселлях і памінках, і маладыя джыгіты, якія на скачках баранілі гонар свайго роду; не толькі таўстапузыя баі, але і вечна худая галота няшчасная нацешыліся краявідамі Сон-Куля. Спраўляліся памінкі, дзе разыгрываліся рабы і дзяўчаты-рабыні, выдатныя скакуны, белыя ястрабы і іншыя птушкі; на гэтыя памінкі запрашалі ўвесь павет, да іх рыхтавалі найлепшых скакуноў. Не толькі шумны натоўп, не толькі гулкі вецер — само возера крычала люта, калі скакуны імкнуліся да славы, — колькі коней збілі капыты, вочы стаміліся глядзець на іх! Групамі праходжваліся дзяўчаты, апранутыя ў шаўкі і паркалі, хлопцы заглядваліся на іх… Ад возера гэтага сыходзіць пах малака, пах дзіцяці, выкармленага матчынымі грудзьмі… Гэта прыстанак парабкаў, у якіх калені пакрыты балячкамі, а скура на пятках парэпалася, гэта прыстанак грэшнікаў, якія ап'янелі ад кумысу, ад сну і не адрозніваюць яву ад сну, здольны аблаяць качку, што з крыкам праносіцца над галавой, прымаючы яе за чалавека. Гэта край, пра які не распавядзеш і за месяц; гэта месца, дзе госці атрымлівалі большае задавальненне, чым на балі. Гэта край заможнасці, дзе галодныя наядаюцца; гэта край беднаты, дзе колькі ні цягай у юрту, усё адно не будзе дастатку. Знахары-бакшы, падобныя на адкормленых за лета казлоў, захапілі гэтыя мясціны; спевакі, песні якіх сыплюцца, быццам пясок, захапілі гэтыя мясціны; знатакі, якія з рашучасцю распавядуць не толькі пра мінулае і сённяшняе, але і пра будучыню, захапілі гэтыя мясціны. Упрыгожвалі іх сабою старцы з доўгімі белымі бародамі, якія спаласнулі свой рот кумысам; упрыгожвалі іх сабою і безбародыя, мудрыя і назіральныя, хоць і змучаныя, падобныя на пеўняў з павыскубанымі хвастамі; упрыгожвалі іх сабою і бурдзюкі, дзе пеніцца кумыс, што можа накарміць нават самых ненаедных. Гэта край, дзе столькі джыгітаў, у якіх толькі-толькі пачалі прабівацца вусы, сталі старэйшымі ў сям'і; гэта край, дзе столькі маладзенькіх дзяўчат дванаццаці-трынаццаці гадоў, у якіх яшчэ не абсохла на губах матчына малако, павыходзілі замуж. Гэта месца, дзе было аб'едзена і выкінута незлічонае мноства галоў — ягнят, авечак, коней і кароў; дзе ладзілі памінкі, вяселлі і частаванні, прымаючы нявестак, праводзячы дачок, а таксама і пры абразанні; там у гонар аднаго чалавека рэзалі авечку, а, расшчодрыўшыся, — і здзічэлае жарабя; там гулялі ў косткі-альчыкі, там казладранне, там пагоня за дзяўчатамі, там дзённыя попрадкі і дзяўчат, і маладзіц — вось што такое Сон-Куль. Акружаюць возера пярэстыя горы, і трава на іх схілах, як шкуркі выдры; здаецца, што прырода з усяго свету выбрала Сон-Куль, каб паказаць тут чалавеку сваю дасканалую прыгажосць.

З кыргызскай.
Пераклад Алеся ЦІМАФЕЕВА

Возера Сон-Куль.

Нурлан КАЛЫБЕКАЎ

Цэласнасць сусвету

Я гэты свет на часткі не дзялю,
адзіныя ў ім белае і чорнае.
Самота й весялосць, дабро і зло —
ўсё цэласна, давеку непадзельнае.
Аднолькава ўсім сонца промні шле —
і госцю ў юрце, і гаспадарам,
святло ж з нізін імкнецца ў вышыню.
Хай той, хто падзяляе гэты свет
на белыя і чорныя дэталі,
аб святасці хто марыць, рвецца ў рай,
і тыя, каму месца толькі ў пекле, —
адправяцца туды, куды заўгодна.
Мяне зусім іх планы не хвалююць,
паколькі свет на часткі не дзялю.
Самой прыроды сутнасць мне цікавая
ў адзінстве абсалютным непадзельным —
як падаюць нябёсныя праменні,
а ім насустрач цягнуцца зямныя.

Так узнікае цэласнасць сусвету.

***

Што для мяне ёсць час? Мядзяк разменны,
гадзіннік старадаўні з мерным ходам,
сувымерным з пульсацыяй быцця.
Так прыгажунь абцасы, чую я,
па маставой пастукваюць і ўвагу
адводзяць гаспадынь іх маладых
ад старасці, што будзе. І змаўкаюць.
Тут зменлівасць — такая рыса часу.
Яна сабой аднойчы нагадае
пыхлівых землякоў аксесуары —
кашулі, шапкі, папкі дзеловыя.
Ўсё гэта будзе розным адпаведна:
увесну, ўлетку, ўвосень ці ў зіму.
Што для мяне ёсць час? Станіцы птушак,
у пошуках цяпла на пералёце,
што звыкліся і з ветрам, і з марозам.
Ён у стагоддзяў цемры, быццам мы,
на крокі свае першыя пусціўся,
каб у канцы шляху, калі стаміўся,
распасціся у прах, навекі знікнуць.
Ёсць ад яго нямала ў чалавеку.
Вось для мяне што адзначае час.
А сам я па-за часам і эпохамі.
Не вымяраю лёс свой і жыццё
зямным адлікам сутак і гадзін.
Шляхоў бясконцых млечных я прымаю
уладу ўсю на небе й на зямлі.
І дні мае, што з клопатам аб хлебе,
надзённым тут, бясконцыя настолькі ж,
як космас наш бяскрайні ледзяны.
І сонца не згасае нада мною,
сусветнае святло ярчэ ў высі.
Яно на ўсіх адно. За ім жа — бездань.
З ёй нашу тленнасць можна параўнаць.
Але без межаў і без пэўных правіл
красуюцца прасторы карагоды.
Сівых часоў ніхто там не злічыў.
Там вечнасць існуе, ці нават Бог.

Адзінота

Ты свеціш мне і згінуць не даеш,
хлусня й падман — мне без цябе ўвесь свет.

Зліліся нашы сэрцы назаўжды,
наш лёс адзін, і зорка ў нас адна.

Усё перамагло яе святло,
калі з ліхвою выпала мне бед.

Калі для ўсіх другіх памеркла высь,
усе па норах распаўзліся ўміг.

Здавалася, што знішчыла мяне
атрута іх паклёпаў і хлусні.

І толькі ты не кінула мяне,
мной дыхала, жыла і берагла.

Хай золата мне горы прынясуць,
за ўсё бясцэнней твой адзін пагляд.

Ты свеціш мне, і ты ўва мне жывеш,
мне без цябе ўвесь свет — хлусня й падман.

Сон

Мой сон — маленечкая смерць.
Я паміраю кожны вечар.
Калі кранаюся падушкі,
то адыходжу я ў нябыт.
Мая душа, нібыта прывід,
гуляе, дзе няма слядоў
ні чалавечых, ні звярыных.
Сустрэну раптам я людзей,
нібы братоў, іх абдымаю.
Па лесе дзіўным я хаджу
і мову дрэваў разумею,
з вярбой сівой вяду размову.
Ад паху кветак, траў і лісця
іду, нібыта ап'янелы.
І так не хочацца губляць мне
Ўсю далікатнасць і пяшчоту.
Архары дзікія ў скачку
рагамі дасягаюць неба
і, зоркі яркія сабраўшы,
мяне іх ззяннем абсыпаюць.
Аднекуль пырхнуць матылькі.
Дрыжаць-трапечуць, як у танцы,
на сцэне казачнай паляны,
павольна сядуць на пялёсткі.
Ад іх палёту ветрык вее,
мне астуджае лоб гарачы.
Такі спакой вакол панує!
Быцця таемны сэнс — бязмежжа!
Мой розум шпаркі без змірае.
Лячу бліскучы, як камета,
і з Месяцам удвух гуляем,
блукаем у ласкавых промнях.
Усмешкай месяц зачаруе,
як дзева казачнай красы.
Душа напоўніцца спакоем,
бязважкая, як дзьмухавец,
ці быццам яблыні пялёстак.
Раптоўна ў гэтую пяшчоту
ўрываецца знянацку громам
званок будзільніка. Кашмар
змяняе райскія карціны.
Я ў жаху, я сябе не помню
між тым і гэтым вымярэннем.
Так сэрца бухае ў грудзях,
між рэбраў б'ецца, як у клетцы.
Свядомасць вернецца ў сябе,
разгойдваючы цяжар цела.
Да новых радасцей гатовы
Дзень пачынаецца з нуля…

З кыргызскай.
Пераклад Рагнеда МАЛАХОЎСКАГА

З пошты «ЛіМа»

Для поўнага ўяўлення

З цікавасцю чытаю старонкі газеты «Літаратура і мастацтва», што прысвечаны асвятленню кніжных навінак, якія расказваюць пра тое, што робяць айчынныя выдавецтвы. Мне здаецца, што няма іншага такога перыядычнага выдання, якое б надавала столькі ўвагі кніжнай справе… Добра, што звяртаецеся і да старой кнігі, да пытанняў букіністычнага кнігагандлю…

Алесь Бачыла.

І я, наколькі дазваляе правінцыяльнае жыццё, наведваючы Мінск, зазіраю ў букіністычныя аддзелы, у кнігарню «Вянок». Адно з маіх зацікаўленняў як кніжніка — збіранне выданняў выбраных твораў. Найперш — двух- і трохтомнікаў. Калі пашчасціць, то набываю і чатырохтомнікі. Апошніх, праўда, было выдадзена, наколькі я ведаю, увогуле вельмі мала. Не ведаю, ці ўдасца мне за сваё жыццё сабраць гэтыя выданні выбраных твораў хаця б з ліку тых, што прыйшлі да чытача ў пасляваенныя гады…

Зусім нядаўна набыў «Выбранае ў 2-х тамах» Алеся Бачылы. Абодва тамы — з 1978 года. Выдадзены «Мастацкай літаратурай». Тыраж — 10 000 экзэмпляраў. Уражвае! Для параўнання: Збор твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах (мяркую па тых тамах, што ёсць у маёй бібліятэцы, — ад 12 да 19-га; іншыя проста не знайшоў) выдаецца тыражом у 1000—2000 экзэмпляраў (чамусьці ў розных тамоў і тыраж розны; відаць, у выдавецтве і не разлічваюць, што пакупнік першага тома будзе набываць апошні, 25-ы). У першым томе Алеся Бачылы — вершы, паэмы. У другім — вершы, паэмы, даследаванне («Дарогамі Максіма» — кніга пісьменніцкіх росшукаў пра невядомыя факты з жыцця Максіма Багдановіча). Мастак выдання — Мікалай Казлоў. Рэдактар — Хведар Чэрня. Надрукаваны двухтомнік на Паліграфічным камбінаце імя Якуба Коласа, які на той час знаходзіўся ў Мінску па вуліцы Чырвоная, 23.

Ужо дома, пасля гарадской мітусні, уважліва гартаю параўнальна невялікія кнігі (сёння, калі выбранае, то тамы і памаштабней, і важаць нямала, і, канешне ж, старонак шмат болей маюць)… І думаю пра тое, што менавіта такі двухтомнік дае мне як цікаўнаму да беларускай паэзіі чытачу самае шырокае ўяўленне пра Алеся Бачылу і яго творчасць. І разумею, што такога характару выданні рабіліся не толькі дзеля саміх пісьменнікаў. Але і для чытача… Зразумела, што на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў вершы, паэмы Алеся Бачылы адкрывалі і тыя чытачы, хто не дачакаўся яго двухтомнага «Выбранага…», ды і тыя, каму дастаткова было пазнаёміцца з адной-дзвюма кнігамі аўтара неўміручага верша, слоў неўміручай песні «Радзіма мая дарагая». А вось двухтомнік — з разлікам на бачылаўскіх чытачоў, на тых, каму цяжка адшукаць зборнікі ранейшага часу, а душа чытацкая прагне болей шырокага знаёмства… Значыць, логіка пэўная ў выданні «Выбранага…» у болей шырокім аб'ёме існуе. Гэта, відаць, важна і для настаўніка беларускай літаратуры. І важна для мяне як чытача, таму і месцяцца на маіх цесных паліцах двухтомнікі Віталя Вольскага, Станіслава Шушкевіча, Васіля Хомчанкі, Васіля Віткі, Анатоля Вялюгіна, Сяргея Грахоўскага… Усё, што з іх творчасці на слыху, можна знайсці на старонках гэтых выданняў.

Але чамусьці не знаходжу ў кнігарнях двухтомнікі твораў пісьменнікаў, блізкіх да нас па сённяшнім часе. Напрыклад, Міколы Мятліцкага, які нядаўна пайшоў з жыцця, ці Міхася Пазнякова, Міхася Башлакова… Пагаджуся, што выданне паэзіі — не камерцыйная справа. Пагаджуся і з тым, што, магчыма, такіх чытачоў і такіх кнігазбіральнікаў, як я, не так і шмат. І ўсё ж заўважу, што попыт нараджае тая прастора, якая існуе… Ці чаму б, напрыклад, выдавецтвам, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі, не заняцца папярэдняй падпіскай на такога характару выданні?..

Фота Кастуся Дробава.

Валерый ПАНАСЮК,
г. п. Карэлічы, Гродзенская вобласць

зваротная сувязь

Лірыкай восені дыхаюць далі

У выхадныя слухайце праект Навума Гальпяровіча пра асабістыя сустрэчы з дзеячамі культуры і мастацтва «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты» і публіцыстычную перадачу Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова» пра тэндэнцыі сучаснай мастацкай літаратуры.

У нядзелю і панядзелак — радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча: сустрэча з пісьменнікам Андрэем Сідарэйкам.

Праграма «Літаратурная анталогія» па буднях прапануе старонкі рамана Дафны Дзюмар'е «Рэбэка». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы раман Івана Шамякіна «Вялікая княгіня». Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі» з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» — вершы Максіма Танка.

У «Радыётэатры плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у выхадныя складуць дзве часткі спектакля «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» паводле п'есы П'ера Бамаршэ.

Для юных прыхільнікаў мастацкага вяшчання з панядзелка да пятніцы ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Прыгоды лісачкі Красуні». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі выдавецтваў.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце www.radiokultura.by і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

10 верасня — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Бірылы (1923—1992), беларускага мовазнаўца, заслужанага дзеяча навукі БССР.

10 верасня 70-гадовы юбілей святкуе Іван Штэйнер (1953), беларускі літаратуразнаўца, крытык.

13 верасня 75-годдзе адзначае Вікенцій Стасевіч (1948), беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, графік.

13 верасня 65-годдзе святкуе Аляксандр Лось (1958), беларускі графік, плакатыст.

14 верасня — 95 гадоў з дня нараджэння Алега Саннікава (1928—1983), беларускага літаратуразнаўца, тэатразнаўца.

14 верасня — 85 гадоў з дня нараджэння Леаніда Левановіча (сапр. Лявонаў; 1938—2021), беларускага празаіка, драматурга.

15 верасня — 125 гадоў з дня нараджэння Мікалая Кавязіна (1898—1950), беларускага рэжысёра, педагога, мастака, тэатральнага дзеяча, заслужанага артыста БССР.

16 верасня — 100 гадоў з дня нараджэння Ганны Герштэйн (1923—2019), беларускага тэатральнага крытыка.

16 верасня 85-годдзе адзначае Віктар Дашук (1938), беларускі кінарэжысёр, сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны артыст Беларусі.

17 верасня — 75 гадоў Аляксандру Грынкіну (1948), беларускаму паэту.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

9 верасня — на фестываль дзіцячай кнігі «У гасцях у Францыска Скарыны», прысвечаны Дню горада, які адбудзецца ў скверы насупраць Нацыянальнай бібліятэкі. Пачатак у 12.00.

13 верасня — у публічную бібліятэку № 11 (пр-д Ташкенцкі, 3) на прэзентацыю кнігі Уладзіміра Мазго «Загадка — розуму зарадка». Пачатак у 13.30.

13 верасня — у публічную бібліятэку № 1 імя Льва Талстога (вул. Маскоўская, 18) на мерапрыемства, прысвечанае юбілею Льва Талстога, з удзелам пісьменнікаў Міхася Пазнякова, Тамары Кавальчук і Андрэя Душачкіна. Пачатак у 14.30.

13 верасня — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Аўтограф» (вул. Карбышава, 42). Госць — Кацярына Роўда, творчы кіраўнік Іна Фралова. Пачатак у 17.00.

13 верасня — у Мінскі гарадскі Тэатр паэзіі пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы (вул. В. Харужай, 16) на спектакль «Твой дзень стваральны славім, Беларусь!» паводле вершаў класікаў і сучасных беларускіх паэтаў. Пачатак у 17.30.

14 верасня — у музей Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) на прэзентацыю кнігі Міхася Пазнякова «Слаўны працай чалавек!». Пачатак у 11.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 07.09.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 670

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавец-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2082

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23036